Министерство образования Республики Беларусь
Учреждение образования
«Барановичский государственный университет»

# Куток беларускай культуры «Я нарадзіўся тут»



Барановичи, 2021 г.

Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь
Установа вышэйшай адукацыіі
«Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт»

## *Куток беларускай культуры*

# *“Я нарадзіўся тут”*

Баранавічы

Аўтары:
Дырда Жанна Мікалаеўна, выхавацель інтэрната

З мэтай вывучэння традыцыйнай народнай культуры і творчасці быў заснаваны Куток беларускай культуры “ Я нарадзіўся тут”. Дадзены куток будуецца на аснове вывучэння традыцый, культуры і побыту тагачаснага беларускага народу, яго гісторыі, а таксама садзейнічае пашырэнню кругагляду ў моладзі, пачуцця прыгажосці і меладычнасці беларускай мовы.

# ЗМЕСТ


**УВОДЗІНЫ** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 5

**РАЗДЗЕЛ 1** БЕЛАРУСКАЯ ХАТКА І ПРЫЛАДЫ ПРАЦЫ. . . . . . . . . . 6

**РАЗДЗЕЛ 2** З ГІСТОРЫІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА КАСЦЮМУ. . . . . . . . . 16

**РАЗДЗЕЛ 3** ВЫРАБЫ З САЛОМЫ, ЛАЗЫ, ЧАРОТУ І ЛЬНУ. . . . . . . . 22

3.1 МАГІЧНЫЯ НАРОДНЫЯ ЛЯЛЬКІ . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 27

**РАЗДЗЕЛ 4** ГАНЧАРНЫЯ ВЫРАБЫ. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 29

**РАЗДЗЕЛ 5** ВЯЛІКАЯ АЙЧЫННАЯ ВАЙНА Ў ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСКАГА НАРОДА . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 32

**РАЗДЗЕЛ 6** МАЯ МАЛАЯ РАДЗІМА . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 36

**ЗАКЛЮЧЭННЕ**. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 40

**ЛІТАРАТУРА**. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 41

**ДАДАТКІ** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 42

# УВОДЗІНЫ

Сучаснае грамадства ўсвядоміла неабходнасць асэнсавання сваіх вытокаў, нацыянальных традыцый, таму прапаганда звычаяў, абрадаў, святаў класічнай літаратурнай спадчыны становіцца асабліва актуальнай. Без традыцый няма культуры, без культуры – духоўнасці, без духоўнасці – выхавання, без выхавання – асобы, якая не павінна забываць пра мінулае. Беларусы на працягу шматвякавой гісторыі стварылі багатую самабытную культуру. Нашым паслядоўнікам належыць пераняць гэтую культуру ў спадчыну, ашчадна захаваць і памножыць яе здабыткі. У міфалогіі, звычаях,абрадах народ перадае свае разуменне высакароднага, каштоўнага і прыгожага, сцвярджэнне сваіх адносін да таго, што складае найгалоўнейшыя маральныя і прававыя асновы жыцця нацыі.

Стараючыся выхаваць новага чалавека, па-за ўвагай пакінулі павагу да продкаў, іх працы, побыту, культуры, мовы, любоў да зямлі. Наша пакаленне забылася пра ісціну: чым вышэй узровень этнічнай культуры людзей, тым багацейшая іх агульная духоўная культура. Той народ, які адчувае адказнасць за лес сваёй культуры, заслугоўвае пашану з боку іншых народаў і ўласнай нацыі. Таму, з мэтай вывучення традыцыйнай народнай культуры і творчасці быў створаны куток беларускай культуры “Я нарадзіўся тут…”. Куток будуецца на аснове вывучэння традыцый, культуры і побыту тагачаснага беларускага народу. Вывучаючы культуру, побыт і традыцыі беларускага народу моладзь значна пашырае свой кругагляд, слоўнікавы запас, а таксама адчувае прыгажосць і мілагучнасць беларускай мовы і вывучае гісторыю свайго народа.

Метадычныя матэрыялы складаюцца з пяці раздзелаў. У першым раздзеле “З гісторыі нацыянальнага касцюму” змешчаны звесткі пра беларускае народнае адзенне, якое фарміравалася на працягу стагоддзяў. У другім раздзеле “Прылады працы” гаворка ідзе пра прадметы штодзённага побыту нашых продкаў. У трэцім раздзеле “Пляценне з саломы, лазы, чароту” гаворыцца пра тое, што здаўна на ўсёй Беларусі бытавалі разнастайныя вырабы, пляцёныя з лазы, саломы, чароту, каранёў, а таксама з льну. У чацвёртым раздзеле “Ганчарныя вырабы” пададзен матэрыял пра ганчарныя вырабы, якія мяняліся на працягу тысячагоддзяў пад уплывам культурна – бытавых, эканамічных і сацыяльных фактараў. Пяты раздзел – гэта “Вялікая Айчынная вайна ў гісторыі беларускага народу”. Праз многія дзесяцігоддзі нельга забыць пра подзвіг народа, які ўнёс вялікі ўклад у Перамогу над фашызмам. Шосты раздзел прысвечаны году Малй Радзімы і называецца “Любі, браток, родны куток”. У дадатку прапанавана апісанне экскурсіі па кутку “Я нарадзіўся тут … “.

Змест метадычных матэрыялаў дапамагае ажыццяўляць комплекснае ўздзеянне на разумовую эмацыянальна-пачуццёвую сферы моладзі, у працэсе якіх фарміруюцца маральныя перакананні, грамадзянская пазіцыя, нацыянальная свядомасць, а таксама праяўляецца творчы патэнцыял маладой асобы.

## Раздзел 1. Беларуская хатка і прылады працы.

Адзін з асноўных рытуальных цэнтраў сялянскага жылля — ачаг, вакол якога ў халодны час групавалася жыццё ў хаце, а таксама рыхтавалася ежа — **печ**. Яшчэ і сёння існуе выраз "танчыць ад печкі", якое недвухсэнсоўна ўказвае на яе цэнтральнае (адно з першарадных) месца ў хаце.

Да печы заўсёды ставіліся з вялікай увагай і павагай. На ёй адпачывалі, яна саграваля і лячыла. Вакол печы былі расстаўленыя ўсе хатнія атрыбуты: венік, вілы, качарга, дзяжа, — а за печкай жыў захавальнік сямейнага дабрабыту — дамавік.

Канструкцыя печы цалкам паўтарала структуру хаты і таксама з'яўлялася ўвасабленнем міфапаэтычнай мадэлі свету. Яе структурныя гарызонты адпавядалі нашаму ўспрыманню часу. Падпечак (як і склеп) сімвалізаваў мінулае; вусце і засланка — дзень сённяшні; труба (комін), якая перакрывалася юшкай (душой, душкай), — будучыню. "Завіхацца каля печы" — выключна жаночы занятак. Падтрыманне агню і падрыхтоўка ежы былі падобныя на падтрыманне жыцця на зямлі.

Печ — захавальніца агню — той энергіі, якая сімвалізуе жыццё ў хаце і яе дабрабыт. У штодзённым жыцці агонь у печы на ноч не тушылі. Перад тым, як зачыніць — "засланіць" — печ ад сонца (адгэтуль і засланка) ці агонь у печы, гаспадыня павінна была засыпаць у невялікае паглыбленне вугельчыкі і прыкрыць іх попелам. Раніцай вугельчыкі раздзімалі, і печ ажывала зноў. Дасведчаныя гаспадыні ведалі: каб захаваць дастатак і дабрабыт у хаце, нельга аддаваць вугельчыкі са сваёй печы, а пераязджаючы ў новую хату, трэба было абавязкова ўзяць з сабою некалькі вугельчыкаў са старой печы і перанесці ў новую.



Печ "замірала", калі ў хаце хтосьці паміраў. Тады на працягу трох дзён агонь у печы распальваць строга забаранялася. Агонь у печы маглі патушыць падчас эпідэміі. Тады ва ўсім паселішчы ў хатах "астывалі" печы. А затым ад хаты да хаты неслі "жыватворны" — ажыўляльны агонь, распалены пры дапамозе трэння. Значная колькасць рытуалаў сямейнай скіраванасці выконвалася пры непасрэдным

удзеле печкі. Белы колер печы і яе месца размяшчэння (каля парога) сведчылі пра ролю пасрэдніка паміж жывымі і мёртвымі. Вярнуўшыся з могілак і зайшоўшы ў хату, трэба было абавязкова прыкласці рукі да печы — "сагрэць" іх, затым зазірнуць у печ, каб пазбавіцца ад нуды па нябожчыку і страху перад ім. Печ заўсёды імкнуліся трымаць зачыненай. Лічылася, калі яе не зачыніць падчас адпраўлення кагосьці ў дарогу, таму чалавеку не пашанцуе. Печ зачынялі, калі жанчыны садзіліся ткаць, каб праца ішла спарней. Выняўшы хлеб ці іншую ежу з печы, яе абавязкова зачынялі, папярэдне паклаўшы туды некалькі пален, каб дабрабыт у хаце "не пераводзіўся".

Сярод беларусаў існавала строгая забарона: пакуль у печы выпякаецца хлеб, на яе нельга садзіцца. Адмысловая ўвага надавалася пячной трубе — коміну. Спецыфічны "выхад" з хаты стаў своеасаблівым каналам паміж "гэтым" і "тым" светам: з коміна вылятаюць і праз яго прылятаюць нячыстая сіла, душы



памерлых, хваробы, доля-нядоля і г. д. Падчас памінальных дзён, якія ладзілі на працягу года, комін адкрывалі, каб душы памерлых маглі прыляцець у хату і "пачаставацца" тымі стравамі, якія гаспадары знарок пакідалі на стале на ноч. Калі ў хаце паміраў чалавек, комін зачынялі, а дзверы адчынялі, каб душа "не выляцела" ў трубу і не дасталася д'яблу. А калі паміраў вядзьмак, усё рабілі наадварот. Пры набліжэнні навальніцы трэба было абавязкова зачыніць трубу, каб нячыстая сіла не ўляцела ў хату і Ілья-грамабой не стукнуў агністай стралой (маланкай). Імкнуліся трымаць трубу зачыненай, калі ў хаце была цяжарная жанчына. Баяліся, што нячыстая сіла выкрадзе душу яшчэ не народжанага дзіцяці. На беларускім Палессі ў дзень восеньскага раўнадзенства выконваўся абрад "Жаніцьба коміна". З гэтага дня агонь уносілі ў хату, з дапамогай адмысловага рытуалу яго "прыручалі" да хаты, злучаючы "шлюбнай сувяззю" з печчу. Калі гублялася скаціна, гаспадыня клікала кароўку менавіта праз комін. Не кожны пячнік мог скласці добрую печ, а толькі той, хто валодаў пэўнай інфармацыяй і прафесійнымі навыкамі, якія перадаваліся з пакалення ў пакаленні і

захоўваліся як тайна. Акрамя гэтага, печ служыла інфарматарам для людзей: — з печкі выскачыў вугольчык — чакай злоснага госця; — у печы штосьці вухкае — хтосьці сыдзе з хаты; — цэгла выпала — у сям'і хтосьці з жанчын памрэ.

Вельмі важным прадметам мэблі быў ложак. Яго заўседы ставілі ў добрае месца, а месца гэтае выбіралася наступным чынам: куды кот сядзе - туды і ложак устане. Дрэннай прыкметай лічылась спаць нагамі да дзвярэй, бо такім чынам выносілі з хаты нябожчыкаў. Пад ложак звычайна клалі бурштын и часнок, у якасьці абароны ад злых сіл.





**ЛОЖАК** — від мэблі, прызначаны для адпачынку і сну. Вядомы з часоў сярэднявечча ў сядзібна-палацавых інтэр'ерах. Гатычныя ложкі — масіўныя, дубовыя, простых прысадзістых форм; часоў рэнесансу і барока — з дугападобнымі спінкамі і выгнутымі ножкамі; класіцыстычныя і ампірныя — простых выразных форм. У народным жыллі набылі пашырэнне з XIX ст., замяніўшы сабой у інтэр'еры хаты пол і палаці, часам бытавалі паралельна. Спінкі ложкаў звычайна змацоўвалі бакавінамі, на якія клалі дашчаны насціл, на яго сяннік і пасцель. Як прыналежнасць чыстай палавіны хаты, ложак аздаблялі па рознаму: надавалі спінкам і ножкам адмысловыя абрысы, дэкарыравалі фігурнымі накладкамі, фляндроўкай і інш. На дзень ложкі засцілалі посцілкай ці накідкай, клалі падушкі з узорыстымі навалачкамі. Сцяну каля ложка



ўпрыгожвалі тканым ці маляваным дываном. Нярэдка ложак з пасцельнымі прыналежнасцямі ўваходзіў у пасаг маладой. У наш час самаробныя драўляныя ложкі выцясняюцца прамысловымі вырабамі: у 1920-50-я гг. металічнымі, у наш час — драўлянымі розных форм і відаў; традыцыйна аздабляюцца тканымі вырабамі прамысловай ці хатняй вытворчасці.

Жыццё імкліва ляціць наперад. І, здабываючы кожны дзень нешта новае для сябе, мы непрыкметна губляем тое святое, спрадвечнае, што нашы продкі называлі непарыўнай повяззю часоў. Нашу малую спадчыну. А яна выяўляецца як у людзях, так і ў прадметах штодзённага побыту мінулых вякоў. Вось



менавіта з мэтай нагадаць сучасніку пра гісторыю беларускай вёскі, яе вытокі і элементы будзённага жыцця нашых продкаў і быў створаны сіламі студэнтаў і персанала нашага інтэрната куток беларускай культуры. Кожная прадстаўленая рэч мае сваю цікавую гісторыю і ў свой час добра паслужыла былым гаспадарам. Некаторыя прадметы і ўвогуле выклікаюць здзіўленне ў наведвальнікаў і лагічнае таму пытанне: “А што гэта такое?”.



Давайце крыху пройдземся па нашым музейчыку. Гэты вялікі кош, які называлі **саж,** зразумела, служыў не для збору бульбы. У яго нашы дзядулі і бабулі складалі сала, каўбасы і падвешвалі на крук да столі, каб не далезлі мышы і пацукі. У некаторых рэгіёнах Гарадзеншчыны з гэтай жа мэтай выкарыстоўвалі драўляныя куфары.

**Кош –** плеценая з лазы, карэння і інш. Круглая пасудзіна для складання і пераноскі чаго-небудзь.



Багата прадстаўлены ў музеі **ганчарныя вырабы**: збанкі, міскі, кубкі. Асаблівую цікавасць выклікаюць макітры. Для беларускай ганчарнай школы больш уласцівы.

Беларусь ніколі не мела ўласнага жалеза, і таму вырабы з яго каштавалі добрых грошаў. Нашы продкі ахвотней выкарыстоўвалі дрэва. Цікавая назва цэнтральнага прадмета. Гэта **трапло**. Ім трапалі лён, і, магчыма, адсюль пайшла мянушка надта гаваркому чалавеку.




**Лубянка** пасудзіна з лубу (кары ліпы і інш. дрэў) на ягады, грыбы і інш. Звычайна цыліндрычнай формы. Выкарыстоўвалі і як сявенька.

**Корабы з лубу** ёмістасць для захоўвання і пераносу сыпучых прадуктаў (збожжа, мукі, круп, гароху і інш.), сплеценых з лубу. Круглыя ці авальныя корабы пераважна мелі канфігурацыю збанка, бочкі, гаршка, часта іх рабілі з вечкам; падстаўкай служылі адно ці два саламяныя звёны або лазовы прут. Мелі добрую вентыляцыю, таму ў іх нядрэнна захоўваліся прадукты. Корабы вылучаюцца разнастайнасцю форм, прыроднай прыгажосцю матэрыялу. Пашыраны былі на большай частцы Беларусі.








**Сіта** драўляная рама з рагожнамі або драцянымі сітамі для правейвання збожжа, якую на вяроўках падвешвалі да бэлькі.

**Пранік** пляскаты драўляны брусок з ручкай, якім перылі (пралі) бялізну пры мыцці, палотны пры адбельванні; ім таксама абівалі лён, проса. На Беларусі вядомы з 11-12ст.

**Качалка** – прылада для разгладжвання тканых вырабаў.




З найстаражытных часоў людзі даглядалі за сваім адзеннем, каб яно пасля мыцця выглядала прыгожа і ахайна. Менавіта для гэтых мэт быў вынайдзены прас. **Прас** – прылада для разгладжвання складак на тканіне.

**Карыта** прадаўгаватая пасудзіна, выдзеўбанная з дрэва або збітая з дошак. Выкарыстоўваецца звычайна для кармлення і вадапою жывёлы.

**Маслабойка** шырока была вядома і ў Расіі, і на Украіне, і ў Беларусі. Гэта звычайна высокая, наканаваная да гары бочка, у вечцы адтуліна для калатоўкі (біла), да ніжняга канца якой (ўдарная частка) мацавалі круг з адтулінамі або крыжавіну.

Доўга ў Беларусі карысталіся **бязменам**. **Бязмен** – даўняя ручная рычажная вага. Металічны або драўляны стрыжань з пастаянным грузам(гірай) на адным канцы і кручком ці чашкай для ўтрымання грузу на другім. На стрыжні шкала адліку і рухомая апора — абойма ці драцяная пятля. Карысталіся бязменам пераважна ў народным побыце.

**Цапы** – доўгія, гладка абчэсаныя палкі з прымацаванымі да іх бічамі; выкарыстоўваліся для малацьбы жыта, аўса, ячменя.

**Таўкач** – прылада ў выглядзе качалкі з патоўшчаным круглым канцом, якой таўкуць што-небудзь.






**Крук** – драўляная палка з сукамі на канцы або з двухзубым наканечнікам для скідвання гною з воза.

**Качарга** – жалезны прут, сагнуты на канцы, для перамешвання палiва ў печы, выграбання попелу і пад.

**Ухват** служыць для падхвату гаршкоў, чыгункоў, якія ставяць у печ або дастаюць з яе.

**Сякера** – прылада працы для апрацоўкі драўніны і іншых матэрыялаў.

**Калаўрот** - прылада для прадзіва. На Беларусі вядомы два тыпы калаўрот-стаяк і ляжак.

Абодва тыпы мелі аднолькавыя рабочыя часткі: кола, педаль, якой кола прыводзілася ў рух і прадзільны апарат. Апошні складаўся са стрыжня і размешчанай на ім шпулькі для намотвання пражы і маленькіх калёсікаў, злучаных пры дапамозе шнуроў з вялікім колам. У калаўроце-стаяку кола знаходзілася паміж двюма вертыкальнымі стойкамі над прадзільным апаратам.

**Сукала** – прылада для намотвання нітак на шпульку ткацкага станка.







**Часала** – прылада для раздзялення валакністых матэрыялаў на аддзельныя валокны з мэтай удалення сорных прымясей.

**Прасніца (на здымку з кудзеляй)** - драўляная прылада для прадзення воўны, льняной і пяньковай кудзелі.

**Верацяно** - прылада для ручнога прадзення льну, воўны, пянькі. У старажытныя часы для гэтага служыла драўляная, крыху завостраная палачка даўжынёй 20-30 см з завостраным верхам, патоўшчаным нізам, на які для павелічэння вагі надзявалі прасліца, і вострай пяткай. Яго выстругвалі нажом або выточвалі з бярозы, ясеню, грушы і інш.



**Бёрда** - ткацкая прылада, што служыць для прыбівання ўтку ў кроснах. Прамавугольная рама (шырыня 40 – 50 см і больш, вышыня 15 – 18 см) з устаўленымі і замацаванымі пласцінкамі (трасцінкамі) з тонкай (1 мм) асінавай ці кляновай лучынкі. У XX ст. берда пачалі рабіць з металічнымі пласцінкамі. Для ткання бёрда ўстаўлялася ў набіліцы. Бёрду выраблялі спецыяльныя майстры – бёрднікі. Памеры бёрда вызначаліся якасцю будучай тканіны. Для атрымання грубай тканіны іх рабілі шырэйшымі, а зубы радзей. Для вырабу тонкіх тканін выкарыстоўваліся больш густыя бёрда.




**Чаўнок** - ткацкая прылада для пракідання ўтку ў працэссе ткання (па знешняму выгляду нагадвае мініацюрны човен). Вядомы дзве разнавіднасці – з донцам і полы. У першым выпадку цэўку кладуць на дно, а ўточную нітку прапускаюць праз адтуліну збоку ці ў донцы чаўнака (у працэссе ткання прытрымліваюць цэўку вялікім пальцам). У

полым чаўнаку цэўку мацуюць на тонкім металічным стрыжні, таму яго не трэба было прытрымліваць (такі чаўнок як больш дасканалы ужываўся часцей. Акрамя лодкападобных вядомы быў і вілкападобны чаўнок – ігліца (дошчачка з дзвюма выемкамі на канцах), які служыў для вырабу падвойных дываноў.

Нашы продкі былі людзі ўмелыя, практычна ўсё для свайго карыстання рабілі сваімі рукамі. Вось як пра гэта пішуць гісторыкі: "Кожная вёска - гэта своеасаблівая дзяржава, з усім сваім - моваю, звычаямі, норавамі і побытам. Ды дзе вёска - кожны гаспадар, кожная гаспадыня імкнуліся быць ва ўсім незалежнымі, самастойнымі, абыходзіцца без чыёй бы і якой бы там ні было дапамогі. Трэба былі саха, барана, плуг, серп, калёсы, сані, сякера, граблі, піла, каса, лыжка, міска, гаршчок, вядро, дзежка, бочка - рабілі; трэба былі хамут, церассядзёлак, боты, світка, кажух, шапка, сарочка, штаны, рукавіцы - шылі; трэба былі вяроўка, атосы, лейцы, аборы - вілі; палатно, абрус, ручнік, коўдра, посцілка - ткалі... Самі, кожны сабе, будавалі хаты, хлявы, гумны, ёўні, лазні…”

# Раздзел 2. З гісторыі нацыянальнага касцюму.

Беларускае народнае адзенне фарміравалася на працягу стагоддзяў. Але асноўныя яго віды і састаўныя часткі, спосабы пашыву і кампазіцыйныя рашэнні, каларыстычныя і арнаментальныя асаблівасці пачалі складвацца з канца XIII ст. адначасова з фарміраваннем беларускай народнасці. Касцюм беларусаў развіваўся ў кантакце з касцюмамі рускіх, украінцаў, а таксама літоўцаў, палякаў, іншых народаў, і поруч са сваімі нацыянальнымі рысамі ён узбагачаўся іншанацыянальнымі.



У часы панавання стылю готыкі ўзнікла тэхніка крою, удасканальвалася кравецкае рамяство, што азначыла цэлы этап у гісторыі касцюма, у тым ліку беларускага. Нескладаныя канструкцыі і простыя сілуэты перыяду Кіеўскай Русі саступілі месца прынцыпова новым. У святочным, а потым і ў будзённым гарнітуры замацаваліся андарак, гарсэт, намітка. Кашуля ўскладнілася распрацоўкай крою, адкладным каўняром, світа - вытачкамі для стварэння аб'ёму, авальным падкроем проймы і аката рукавоў. Змясціліся акцэнты дэкору, а сам ён стаў больш разнастайны і вытанчаны. Усё гэта было крокам наперад у секулярызацыі касцюма ад хрысціянскіх догмаў, ад іх патрабавання старанна хаваць цела.

Набліжаны да абрысаў чалавечай фігуры, эстэтычна змястоўны, ён адпавядаў духу рэнесансавага светаўспрымання. Беларускі касцюм XVI ст. меў характэрныя прыкметы касцюма эпохі Адраджэння, а з найбольш спецыфічных - тэндэнцыі да агульнай строгасці ансамбля, перавагі спалучэння белага з чырвоным у каларыстыцы, геаметрычных узораў у арнаментыцы. Беларускі касцюм набыў завершанасць як цэласная сістэма, свой утылітарны і мастацкі вобраз.

Далейшае яго развіццё ад XVII да сярэдзіны XIX ст. ішло не па шляху карэнных пераўтварэнняў, а па шляху тых ці іншых змен, звязаных з мадыфікацыяй элементаў адзення, насычэннем каляровай гамы, пераасэнсаваннем арнаментальных матываў, замацаваннем рэгіянальных адметнасцей. Аднак развіццё не было прасталінейным. Яно адбывалася ва ўмовах разлажэння феадальнага ладу і станаўлення капіталістычных адносін. У другой палове XIX ст., а ў раёнах з больш трывалым патрыярхальным укладам к канцу XIX – пачатку XX ст., разам з фарміраваннем беларускай буржуазнай нацыі яшчэ больш выразна акрэсліваецца этнаграфічнае аблічча беларускага народнага адзення як важнага паказчыка нацыянальнай культуры. Менавіта касцюм беларускіх сялян гэтай пары выступае як традыцыйны, класічны ўзор народнага мастацтва. Аднатыпны для ўсёй Беларусі, ён разам з тым мае шэраг лакальных разнавіднасцей - строяў.



Сярэднекантынентальны клімат беларускага краю вымагаў адносна цёплага і закрытага адзення. Матэрыял для яго давала мясцовая сыравіна - лён, радзей каноплі, воўна ў натуральнай і паўнатуральнай сялянскай гаспадарцы, вытканая ў хатніх умовах, на кроснах. Фарбавалі прыроднымі фарбавальнікамі - настоямі траў, кары, лісця і шышак дрэў, балотнай жалезнай рудой. Ільняныя тканіны, якія ішлі на кашулі, фартухі, галаўныя ўборы, не фарбаваліся. Белае палатно аздаблялі звычайна чырвоным геаметрычным арнаментам, які рабіўся натыканнем ці вышыўкай. У старажытнасці чырвоны колер сімвалізаваў жыццё, а нанесены з дапамогай арнаменту на каўнер, разрэз пазухі, рукавы, ніз адзежыны служыў засцерагальным знакам. Ён жа адыгрываў істотную кампазіцыйную ролю, яднаючы часткі адзення ў мастацкае цэлае. Паліхромнасць уласціва суконным і паўсуконным тканінам паяснога адзення, а таксама поясу. Тут вышыўка амаль адсутнічае, а тканы ўзор вызначаецца сакавітасцю тонаў, смеласцю іх спалучэнняў - чырвоны, зялёны, сіні, белы. Удала выкарыстоўваліся ў аздобе касцюма натуральныя серабрыстыя тоны льну і воўны. З другой паловы XIX ст.

са з'яўленнем анілінавых фарбавальнікаў і фабрычных нітак спектр колераў дапоўніўся аранжавым, фіялетавым, блакітным, малінавым, ярка-зялёным.



Традыцыйны комплекс мужчынскага адзення складаўся з палатнянай кашулі, нагавіц, камізэлькі. Кашулю насілі навыпуск, падпяразвалі поясам, калошы абкручвалі анучамі, абувалі лапці, скураныя пасталы, пазней - боты. Галаўным уборам былі саламяны капялюш ці валеная магерка. Закончанасць ансамблю прыдавала скураная сумачка-шабета, якую падвешвалі цераз левае плячо ці да пояса. Мужчынскі касцюм сціплы паводле аздаблення. У ім пераважаў белы колер, а дэкор прыпадаў на каўнер, пазуху кашулі і перш-наперш на кідкі ў вочы рознакаляровы пояс з кутасамі.

Асабліва высокага ўзлёту фантазіі і майстэрства мастацтва беларускага народнага адзення дасягнула ў жаночым касцюме. Самабытнасць яго вызначае самабытнасць нацыянальнага касцюма беларусаў увогуле. Так, найважнейшая частка адзення - кашуля, якую насілі ў любым узросце, сацыяльным і сямейным становішчы, у будні і святочны дзень, увабрала ў сябе, як у фокус, характэрныя канструкцыйныя прыёмы і дэкаратыўныя прынцыпы беларускага касцюма. У залежнасці ад крою ў жаночай кашулі вылучаюцца тры асноўныя тыпы: тунікападобная; з прамымі плечавымі ўстаўкамі; з гесткай. Каля адкладнога, радзей стаячага каўняра тканіна прызбіралася і аблягала шыю, а спераду каўнер завязваўся чырвонай жычкай або зашпільваўся на шпонку ці гузік; прызбіраўся на каўнерац і ніз рукава. Найбольшую ўвагу звярталі на ўпрыгожанне рукавоў, што звязана з мастацкай тэктонікай і пластыкай касцюма, а таксама з верай у

магічную, сілу чырвонага рамбічнага арнаменту, які нібыта засцерагаў рукі ад злых духаў, надаваў моц і дужасць як асноўным у працы.

Разнастайнае паясное адзенне беларускіх жанчын: многія віды спадніц (андарак, палатнянік, саян, летнік), панёвы, фартухі. Іх кроілі з некалькіх прамавугольных полак і багата аздаблялі. Дэкаратыўны малюнак спадніцы і панёвы - клетка, падоўжныя або папярочныя палосы ў чырвоным, сіне-зялёным ці серабрыста-белым каларыце.



Кампазіцыйна-арнаментальнае вырашэнне фартуха адпавядала вырашэнню кашулі і гарманізавалася з ёю. Апрача таго, фартух упрыгожваўся карункамі, махрамі і быў прыкметнай часткай касцюма. У жаночае, асабліва святочнае, убранне ўваходзіў таксама гарсэт. Звычайна ён меў выгляд кароткай безрукаўкі, якая шчыльна абхоплівала стан і рабіла фігуру зграбнай і жаноцкай. Шылі гарсэт пераважна з мануфактурных тканін (аксаміт, парча, шоўк) чорнага, блакітнага, малінавага колеру, кроілі з глыбокім выразам пазухі і баскай па нізе, якая вырашалася фальбонамі ці клінамі, аздаблялі нашыўкамі стужак, тасёмак, гузікаў.

Абавязковым элементам комплексу быў featuring рознакаляровы, звычайна чырвона-зялёна-белага арнаменту, пояс - тканы, плецены ці вязаны, з кутасамі,

махрамі або пампонамі. Прычоскі і галаўныя ўборы строга залежалі ад узросту і сямейнага становішча жанчыны. Традыцыйная прычоска дзяўчат - адна ці дзве касы з уплеценымі каснікамі, а галаўныя ўборы - перавязкі накшталт вузкіх ручнічкоў (скіндачка, шлячок), вянкі. Замужняй кабеце не дазвалялася паказвацца на людзях з непакрытай галавой. Адсюль - большая складанасць і разнастайнасць галаўных убораў. Па сваёй будове яны падзяляюцца на ручніковыя (намітка, сярпанка, хустка), рагацістыя (галовачка, сарока, рожкі), каптуровыя (каптур, чапец). Самы пашыраны і самы адмысловы ўбор - намітка. Яна мноствам спосабаў павівалася вакол галавы на спецыяльным каркасе, канцы яе прыгожа драпіраваліся на спіне, а постаць жанчыны атрымлівала выключную статнасць і велічнасць.

Будзённым абуткам жанчын служылі лапці, святочным - скураныя пасталы і чорныя хромавыя чаравічкі.

Верхняя мужчынская і жаночая вопратка маглі адрозніваццa паміж сабой. Яе шылі з валенага нефарбаванага сукна (світа, сярмяга, латушка, бурка, бурнос), аўчыны (кажух, кажушок, казачына). Дэкаратыўнасць найбольш выяўлялася ў святочных світах і кажушках, якія па-майстэрску кроіліся, упрыгожваліся шнурком, аплікацыяй, вышыўкай. Кажухі і кажушкі былі белыя недублёныя, пазней чырвона-вохрыстыя дублёныя.

Своеасаблівае люстра шматвяковага жыцця народа, касцюм беларусаў канца XIX - пачатку XX ст., усе яго формы не былі аднароднымі, як не было аднародным само сялянства, расслаенне на кулацтва і беднату сярод якога ішло ў гэты перыяд вельмі інтэнсіўна. Рост таварна-грашовых адносін, масавага адыходніцтва, пранікненне ў вёску прамысловых вырабаў размывалі "жанравыя" межы традыцыйнага народнага касцюма. Якраз на піку сваёй класічнай ураўнаважанасці ён зазнаў адчувальныя змены. Ды і ўнутраныя законы самога мастацтва выклікалі далейшыя зрухі, абнаўленне эстэтычных ацэнак. Моцны ўплыў гарадскога касцюма з яго тэндэнцыяй да спрашчэння і універсалізацыі форм, шырокае выкарыстанне тэхнічных фарбавальнікаў з яго тэндэнцыяй да паліхромнасці і расквечвання тканін і іншае прадракалі карэнныя пераўтварэнні народнага касцюма. Аднак з прычыны адсталасці матэрыяльнай базы, нізкага жыццёвага ўзроўню насельніцтва такія пераўтварэнні не маглі адбыцца.

Толькі пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі, якая непазнавальна змяніла ўсе сферы жыцця, народнае адзенне беларусаў уступае ў якасна новы этап развіцця. Адны віды і састаўныя часткі адзення выйшлі з ужытку, а тыя, што захаваліся, і тыя, што ўзніклі, сталі зручнымі і дасканалымі. Поруч з ільнянымі і шарсцянымі тканінамі распаўсюдзіліся баваўняныя, шаўковыя і іншыя. З'явіліся невядомыя раней матэрыялы, спосабы аздаблення. І мужчынскі, і жаночы касцюмы сталі багатымі, разнастайнымі, сугучнымі свайму часу.

У 20-30-я гады XX ст. шматколернасць і сакавітасць фарбаў пашыралі сферу бытавання на кашулі, фартухі, хусткі. Каларыт адзення рабіўся больш стракаты, спалучэнне колераў - больш смелае. Замест чыстых і глыбокіх тонаў пачалі прымяняць пераходныя. Гублялася семантыка традыцыйнага для Беларусі геаметрычнага арнаменту, усё большае месца адводзілася раслінным узорам. У строгую геаметрыю ўзорыстых тканін і вышывак урываюцца матывы, якія называюць: "ружы", "валошкі", "незабудкі", "званочкі", а дзе-нідзе паяўляюцца стылізаваныя выявы галубкоў, паўлінаў і іншыя заалагічныя матывы. Выкарыстоўваючы фарбавыя нюансы, майстрыхі дасягаюць каляровасветацяневага эфекту, і да сярэдзіны XX ст. акрэсліваецца новая ступень у развіцці мастацкіх сродкаў беларускага народнага касцюма: плоскасны малюнак набывае ілюзію аб'ёму.



Магутная матэрыяльна-тэхнічная база сацыялізму, няўхільны рост дабрабыту працоўных, павелічэнне вытворчасці тавараў народнага ўжытку, расшырэнне сеткі прадпрыемстваў бытавога абслугоўвання абумовілі гістарычна апраўданае затуханне традыцый народнага касцюма. Але ён быў і застаецца невычэрпнай крыніцай натхнення, матываў і вобразаў для сучасных прафесійных творцаў, выдатным помнікам народнага дэкаратыўна- прыкладнога мастацтва.

## РАЗДЗЕЛ 3. ВЫРАБЫ З САЛОМЫ, ЛАЗЫ, ЧАРОТУ І ЛЬНУ

Здаўна на ўсёй Беларусі бытуюць разнастайныя вырабы, пляцёныя з лазы, саломы, чароту, каранёў. Асабліва шырока скарыстоўвалася для гэтых мэтаў




**салома.** Здавалася б вельмі празаічны матэрыял. Тым не менш салома прыдатная для вырабу самых розных рэчаў, як гаспадарчага, так і мастацкага прызначэння. Часцей за ўсё з яе плялі самы розны посуд – ад маленькіх гарчыкаў і каробак да вялікіх у рост чалавека шыяноў і кублаў, куды можна насыпаць з паўтоны зерня ці мукі. Формы посуду простыя, але разнастайныя, цыліндрычныя, бочкападобныя, накшталт збанка і іншых. Плялі такі посуд з саламяных жгутоў, якія укладвалі па спіралі і пераплятали лазовымі дубцамі. Такая тэхналогія пляцення называецца спіральным пляценнем. Прыгожая рытміка гарызантальных залацістых жгутоў саломы і вертыкальнага малюнка карычневай лазовай аплёткі – надае пэўнае мастацкае аблічча, хоць у народным побыце такі посуд меў чыста гаспадарчае прызначэнне і захоўваўся звычайна ў сенях, свірне, каморы. Як бачым практычная дасканаласць спалучаецца у гэтых вырабах з мастацкімі якасцямі.

З асаблівым майстэрствам выпляталіся рэчы, якія прызначаліся у падарунак, гэта розныя куфэркі, шкатулкі, прызначаныя для жаночага рукадзелля, нітак, іголак, іншай драбязы.



Аснову дэкору складалі гранёныя пляцёнкі, выпуклыя рамбічныя ўстаўкі, шахматна-перапляцёныя разнагладжаныя саломінкі. Ўсё гэта вышывалі на кардонную аснову і атрымліваўся надзвычай дэкаратыўны выгляд, які меў не толькі практычнае, але і мастацкае прызначэнне, як упрыгожанне жылля. Падобныя рэчы плятуць і сёння, паколькі яны з’яўляюцца добрай аздобай сучаснага інтэр’ера, добрым падарункам.

У народным побыце шырока бытавалі саламяныя капелюшы, брылі. З саломінак плялі доўгую саламяную пляцёнку, якую затым выгіналі па спіралі і зшывалі у прыгожы, лёгкі, зручны выраб.

Яшчэ не так даўно практычна у кожнай сялянскай хаце можна было бачыць так званы ***павук***, ажурную канструкцыю з саломінак, якую падвешвалі у покуці над сталом. У патоках цёплага паветра, якое уздымалася ад ежы, паволі паварочваўся то ў адзін, то ў другі бок, паблісківаючы залацістымі саломінкамі у сонечных праменях.



**Павукі** - традыцыйнае мастацтва — праява самасвядомасці пэўнай асобы і цэлага народа. Напрыклад, возьмем саламяных павукоў. Выраблялiся яны ўсёй сям’ёй да дня зімовага сонцастаяння. Павукі сімвалізавалі сусвет і яго стваральніка, таму вешаліся на ганаровым месцы — над сталом ці на покуці, а пасля зімы спальваліся. Ці тыя ж вербы, якія ўпрыгожваюць на Вербніцу, — гэта яшчэ дахрысціянская традыцыя. Сюды закладзены культ

уваскрасення, абуджэння прыроды ад сну пасля зімы. І, ведаючы гэта, я не магу ўпрыгожыць вярбу пластыкавай кветкай.



Упрыгожанне павінна быць натуральным, прыродным. Разнастайныя вырабы з саломы здаўна самым цесным чынам звязваліся з каляндарнымі абрадамі і звычаямі.

Напрыклад, на Каляды рабілі фігурку ў выглядзе казы, і яна сімвалізавала сабой культ урадлівасці і пладавітасці. А ведаеце, што такое «павук»? Раней у сялянскіх хатах «павукоў» рабілі дзеці, а бацькі вывешвалі напярэдадні Калядаў у самым пачэсным месцы — чырвоным куце. «Павук» аберагаў жыллё, збіраў у «павуціну» сваёй канструкцыі ўсё негатыўнае, што магло перашкодзіць шчасліваму жыццю гаспадароў. Праз год «павука» палілі, замяняючы на новы. Такое ж кароткае жыццё было ва ўсіх рытуальных вырабаў з саломкі: у пачатку абрада яны нараджаліся, у канцы — паміралі. Саламяныя вырабы зараз набываюць больш у якасці сувеніраў: кветачкі для ўпрыгожвання інтэр’еру, павукі ў якасці падарунка замежным гасцям або для сябе, каб вярнуць калядныя традыцыі. Раней гэта мастацтва было нашай экзотыкай, шмат замежнікаў прыязджала паглядзець. Асабліва шырокі наплыў быў расейскіх турыстаў. У сувязі з гэтым многія майстры сталі арыентавацца на іх і рабіць лялькі-абярэгі, венікі на шчасце, на багацце і падобныя нетрадыцыйныя вырабы. Каб прывабіць пакупніка, сучасныя майстры прыдумваюць новыя дызайнерскія формы,

напрыклад саламяны ровар, скрыпка. Менавіта такія вырабы зараз карыстаюцца большай папулярнасцю сярод гараджан. Салома ў інтэр'еры мае дачыненне да нашай ментальнасці. Гэта цешыць наша вока, уздзейнічае на нашу падсвядомасць. Натуральныя матэрыялы прываблліваюць не толькі формай, але і якасцю, выглядам.

Сёння найбольш пашыраным відам саломапляцення які стаў шырока вядомы за межамі краіны з'яўляецца выраб аб'ёмных фігурак: людзей, жывёл і



нават цэлых кампазіцый на фальклорныя, бытавыя, гістарычныя тэмы. Яны ярка ілюструюць асаблівасці развіцця гэтага віду беларускага народнага мастацтва за некалькі апошніх дзесяцігоддзяў. Саламяныя фігуркі людзей, жывёл, птушак у народным побыце вядомыя здалёк. Большасць з іх несумненна падзялялася магічнымі функцыямі – яны былі сімваламі урадлівасці у земляробчых абрадах, абярагалі ад нячыстай сілы. Сімвалічная роля іх дыктавалі форму, гранічна спрошчаную і ўмоўную. Лён сінявокі - сімвал Радзімы, наш беларускі, мілы адзіны.

Лён для Беларусі - нацыянальнае багацце. Сёння традыцыя ільняных вышываных ручнікоў беражліва захоўваецца беларусамі. Славіцца Беларусь і сувенірнай прадукцыяй, выраблены з лёну (лялькі, абярэгі, сурвэткі і інш.).



У знак падзякі і шматвяковай вернасці гэтай культуры беларускі народ увекавечыў кветкі лёну ў Дзяржаўным гербе Рэспублікі Беларусь як сімвал пераўтваральнай моцы працы, знак дабра і дастатку. Шануецца лён і як прыродны сімвал Радзімы.

У народзе існуе павер'е, што сімвалам лён стаў па многіх прычынах: лён з'яўляецца традыцыйнай культурай Беларусі; блакітны колер вачэй беларусаў асацыіруецца з блакітнымі кветкамі лёну. А яшчэ таму, што лён - гэта ўвасабленне беларусак, такіх жа чыстых і пясчотных, як ільняное белае палатно.

## РАЗДЗЕЛ 3. 1 МАГІЧНЫЯ НАРОДНЫЯ ЛЯЛЬКІ

Тканевая лялька ў народнай традыцыі – адзін з самых старажытных сродкаў кантактавання з прыродай, з навакольным светам, з нябачнымі істотамі Сусвету і са сваім прыхаваным “Я”. Сюды ж прымыкаюць і лялькі гэтак званыя культавыя, што паслугуюць камунікацыям з продкамі, з родам і адлюстроўваюць традыцыйныя ў народнай культуры стасункі з іншасветам праз пасярэдніцтва пэўных атрыбутаў.





А таму не толькі дзеля дзіцячай забавы стваралі жанчыны лялькі. Дый лялька-цацка таксама здабывалася за конт энэргіі тканіны, з якой рабілася, і энэргіі рук майстрыцы, асаблівую цеплыню, і такім чынам уплывала на малечу псыхалягічна, эмацыйна.

Аднак місія лялек куды больш шырокая, чым пацяшанне і абарона дзяцей: ва ўсялякім узросце і з розным сацыяльным статусам старадаўні чалавек часта “давяраў” ляльцы вырашэнне нейкіх праблем альбо спаўненне планаў і мар. Бо мэтапаэтычнае мысленьне нашых папярэднікаў і адносіны да свету як да жывой, зменлівай, рухомай матэрыі “надыктоўвалі” менавіта гэткія паводзіны ў соцыуме –



зблiжэнне прыроднай, дзiкай прасторы з прасторай культуры.

І невыпадкова акурат ляльцы пачэсна выпадае зводзіць у АДНУ ЦЭЛАСЦЬ гэтыя дзве процілегласці свету, дзве эвалюцыйныя лініі. Бо правіць усім нябачным працэсам містычная багіня Ляля (Леля, Лёля) – дачка Лады, апякунка веснавога адраджэння зямлі, светлага кахання і маладосці, імя якой і перанеслася на лялькі (адсюль жа бяруць пачатак купальскія песні з рэфрэнамі “Ладо, лё-лё-лё!”; люлянні і люлянкі дзетак; красавіцкае дзявоцкае свята “Ляльнік”, украінская назва бусла — лэлэка; балгарскае найменне вогнішчаў, распальваных ад вясны да Купалля, пакуль валадараць Лада з Ляляй, — алелія, ойлалія і запаленай бярости – ліла).

А таму, з векавечнай логікі, менавіта на жанчыну, пад наглядам Ражаніц Лады і Лялі, ускладалася адказная роля “нараджэння” лялек. Заўважым: нараджэння. Гэтаксама, як і дзяцей.



Заўважым: нараджэння. Гэтаксама, як і дзяцей. Нават самое стварэнне лялькі рэглямэнтавана неаспрэчнымі “законамі”: абавязковасьць доўгай апранкі, якая мае закрыць інтымныя зоны, але аголеньне сцягна (аж да паху!) – імітаванне з'яўлення лялькі праз родавыя шляхі як дадзенасці неба і зямлі.

Нездарма ж лялькі як асобны від народнай культуры адносяцца да жаночай прадукавальнай, ачышчальнай і ахоўнай магіі. Якраз жанчына ж была спрадвеку пераемніцай і захавальніцай розных практык лекавання, абеpажэння жытла і сям’і, досведу гаспадарання і зладжання ўсяго з усім у свеце.

# Раздзел 4. Ганчарныя вырабы.

**ГАНЧАРНЫЯ ВЫРАБЫ** – посуд і іншыя гаспадарчыя і дэкаратыўныя рэчы з гліны.




Форма ганчарных вырабаў мянялася на працягу тысячагоддзяў пад уплывам культурна – бытавых, эканамічных і сацыяльных фактараў. Самыя раннія – вастрадонныя, пазней кругладонныя пасудзіны – гаршкі і кубкі. З развіццём земляробства і жывёлагадоўлі вытворчасць прадуктаў харчавання павялічылася, больш разнастайнай стала ежа і способы яе гатавання, што абумовіла змены ў формах ганчарных вырабаў.

У бронзавым веку масавае пашырэнне атрымаў пласкадонны посуд, які выраблялі ўжо ў канцы неаліту. У шырокі ўжытак увайшлі прафіляваныя гаршкі для гатавання і захоўвання ежы, міскі, кубкі. Гліняныя пасудзіны выкарыстоўвалі і ў пахавальным абрадзе.

У жалезным веку ганчарныя вырабы сталі больш разнастайнымі, павялічыліся варыяцыі форм вядомых раней пасудзін, паявіліся новыя – патэльні, кубкі з вушкамі, гаршкі з накрыўкамі.

У 10 – 13 ст. асартымент ганчарных вырабаў шырокі: гаршкі, латушкі, карчагі, міскі, гарлачы, кубкі, галаснікі, каганцы, цацкі

дзіцячыя і інш. Практычна ўсе вядомыя ў той час ганчарныя вырабы бытавалі і на працягу наступных стагоддзяў. Змены ў большасці пасудзін датычыліся ў асноўным абрысаў. Форма асобных рэчаў – карчаг і кафлі – істотна змянілася.



У перыяд позняга феадалізму асартымент ганчарных вырабаў працягваў ускладняцца, сталі больш пашыранымі талеркі, рынкі і інш.У 19 – пачатку 20 ст. ганчарныя вырабы былі вельмі разнастайнымі паводле форм і бытавога прызначэння. Рабілі посуд для гатавання (гаршкі, бабачнікі, латкі, макатры, пражэльнікі, рынкі, цадзілкі, адстойнікі і інш.), для захоўвання і транспарціроўкі прадуктаў (збаны, гарлачы, глякі, слаі, спарышы і інш.), сталовы посуд (міскі, паўміскі, кубкі, хлебніцы, маслёнкі, чайнікі, імбрычкі і інш.), рэчы featuring рознага гаспадарчага ўжытку (рукамыі, паілкі, пасудзіны для гонкі дзёгцю і іншыя), дэкаратыўную кераміку (фігурны посуд і



скульптуру малых форм у выглядзе жывёл, букетнікі, вазоны і інш.); ляпілі таксама цацкі. Самастойнае значэнне набыла вытворчасць кафлі і дахоўкі. Вырабы аздаблялі геаметрычным і раслінным арнаментам, які прачэрчвалі ці штампавалі па сырой паверхні посуду, глянцавалі, размалёўвалі белым і чырвоным ангобам, каляровымі фарбамі.

У наш час асартымент ганчарных вырабаў прыкметна звузіўся. У ім пераважаюць збанкі, гаршкі, вазоны. Шэраг традыцыйных керамічных рэчаў (глякі, міскі, спарышы, збанкі і інш.) выкарыстоўваецца насельніцтвам, асабліва гараджанамі з дэкаратыўнай мэтай. Тэхніка і тэхналогія іх вытворчасці ганчарамі – надомнікамі амаль не змянілася. На прадпрыемствах асноўныя

працаёмкія вытворчыя працэсы механізаваны (машыны для падрыхтоўкі фармовачнай масы, ганчарныя кругі з электрамеханічным прыводам і інш.). Вырабляецца бытавы (збанкі, вазоны), разнастайны дэкаратыўны і сувенірны посуд, у тым ліку фігурны, сталовыя і кафейныя наборы, букетнікі і інш.

Прыгажосцю вызначаецца залацісты колер паверхні, які яшчэ выразней выдзяляецца пад шклопадобнай палівай. Часам посуд аздаблялі роспісам у выглядзе паяскоў, зігзагаў, раслінных парасткаў. Разнастайны мастацкі эфект набываў посуд і ад абпалу. Напрыклад, надта каларытна выглядае ***гартаваны, ці рабы, абварны*** посуд. Напаленыя у горне вырабы загартоўваліся у карыце, з рэдка разведзенай мукой. Посуд станавіўся моцным пры гэтым пакрываўся маляўнічымі чорна-карычневымі плямамі.



Характэрнае аблічча мае і ***чорна-глянцаваная*** кераміка. Яе абпальвалі ў наглуха закрытым горне без доступу кіслароду. У выніку пэўных хімічных рэакцый у гліне вырабы набывалі матавы чорны ці сіняваты колер. Калі ж перад абпалам ганчар каменчыкам наводзіў на паверхні посуду разнастайныя узоры, яны станавіліся бліскучыя, нібыта металічныя.

Асобныя, найбольш умелыя майстры выраблялі арыгінальныя фігурныя сасуды у выглядзе бараноў, мядзведзяў, ільвоў, што уяўляюць сабой своеасаблівую народную скульптуру. Такія сасуды былі арыгінальнай аздобай інтэр’ера. Іх беражліва захоўваюць як сямейную каштоўнасць. Часамі іх вырабляюць і сучасныя майстры – ганчары, як, напрыклад, ***Міхаіл Звярко*** з Івянца Валожынскага раёна.

# Раздел 5. Вялікая Айчынная вайна ў гісторыі беларускага народу.




У гады Вялікай Айчыннай вайны Беларусь страціла кожнага трэцяга жыхара, але нават залітая крывёй мільёнаў людзей, разрабаваная і напаўразбураная, краіна не здавалася. Праз многія дзесяцігоддзі памяць пра подзвіг народа, які ўнёс вялікі ўклад у Перамогу над фашызмам – свяшчэнная.

Сярод 34,4 мільёна савецкіх воінаў, якія ўдзельнічалі ў баявых дзеяннях на франтах Вялікай Айчыннай вайны, больш за 1,3 мільёна – беларусы і ўраджэнцы Беларусі.

На беларускай зямлі Вялікая Айчынная вайна (22 чэрвеня 1941 г. – 9 мая 1945 г.) доўжылася 3 гады 1 месяц і 6 дзён – з 22 чэрвеня 1941-га па 28 ліпеня 1944 года. Тут праходзілі маштабныя баі і ваенныя аперацыі, сярод якіх:

- гераічная абарона Брэсцкай крэпасці ў першыя дні вайны;
- абарона Магілёва, які не здаваўся 23 дні і ночы;
- "Баграціён" – адна з найвялікшых наступальных аперацый у гісторыі чалавецтва…

Акупіраваная фашыстамі Беларусь стала краінай, дзе разгарнуўся буйнейшы ў Еўропе партызанскі і падпольны рух. Супраць захопнікаў змагаліся больш за 374 тысячы партызан, больш як 70 тысяч удзельнікаў налічвала антыфашысцкае падполле.

Першы партызанскі бой Другой сусветнай вайны правёў 28 чэрвеня 1941 годаў наваколлі Пінска атрад легендарнага камандзіра Васіля Каржа.

Першымі партызанамі-героямі СССР у 1941 годзе сталі беларусы Ціхан Бумажкоў і Фёдар Паўлоўскі.

У ліпені 1943 года на чыгуначнай станцыі ў Асіповічах партызаны ажыццявілі буйнейшую дыверсію, узарваўшы 4 нямецкія эшалоны з боепрыпасамі і танкамі "Тыгр". А адным з самых вялікіх партызанскіх баёў у гісторыі вайны стала Полацка-Лепельская бітва 1944 года.

Да канца 1943 года пад кантролем партызан знаходзілася 108 тысяч км² – амаль 60% акупіраванай праціўнікам тэрыторыі. Сярод самых вялікіх партызанскіх зон былі Клічаўская, Полацка-Лепельская, Суражскія (Віцебскія) "вароты"…

У час Вялікай Айчыннай вайны менавіта ў беларускім Мінску дзейнічала самае вялікае гарадское антыфашысцкае падполле ў Еўропе.




Адной з самых памятных старонак гісторыі мінскага супраціўлення стала аперацыя па ліквідацыі стаўленіка Гітлера ў Беларусі – гаўляйтара Вільгельма Кубэ. У ноч на 22 верасня 1943 года ў пасцелі ката, які знішчыў сотні тысяч жыццяў, узарвалася смяротная міна.

Праз гады гэта гісторыя была пакладзена ў аснову сюжэту вядомага савецкага фільма "Гадзіннік спыніўся апоўначы" – першай кінастужкі аб героях мінскага падполля.

Аднак нягледзячы на гераічнае супраціўленне народа, Беларусь, якая стаяла на шляху нацысцкай

арміі Германіі, несла ў гады вайны незаменныя страты.

На беларускай зямлі былі разрабаваны і разбураны 209 з 270 гарадоў. Фашысты правялі ў Беларусі больш за 140 карных аперацый, поўнасцю або часткова знішчыўшы 5454 вёскі.

Сумна вядомым сімвалам бязлітаснай расправы стала спаленая разам з людзьмі Хатынь, лёс якой падзялілі яшчэ сотні вёсак краіны…



На тэрыторыі Беларусі фашысты стварылі больш як 260 лагераў смерці і месц масавага знішчэння людзей. У гэтым трагічным спісе:

- чацвёрты па велічыні ў Еўропе лагер смерці "Трасцянец", дзе знішчылі больш за 200 тысяч чалавек (ёсць сведчанні, што ахвяр было намнога больш – амаль 546 тысяч);
- жудасны дзіцячы канцлагер у вёсцы Чырвоны Бераг, дзе самымі бесчалавечнымі спосабамі з юных ахвяр – да смерці – забіралі кроў для патрэб нямецкіх шпіталяў;
- Азарыцкая зона смерці, дзе пад адкрытым небам нацысты трымалі тысячы хворых на сыпны тыф, збіраючыся выкарыстоўваць людзей у якасці бактэрыялагічнай зброі супраць наступаючай Чырвонай Арміі…

Паводле няпоўных даных, у лагерах на тэрыторыі Беларусі нацысты знішчылі амаль 1,5 мільёна чалавек – не толькі мясцовых жыхароў, але і вывезеных з Аўстрыі, Польшчы, Чэхаславакіі, Францыі, Германіі…

Пасля заканчэння той страшэннай вайны Беларусь яшчэ доўгія гады аднаўлялася ад разбурэнняў і страт. І да нашых дзён краіна свята шануе памяць аб ахвярах фашызму, подзвігу герояў і мужнасці людзей, якія жылі ў цяжкі час і аддавалі ўсё, каб наблізіць доўгачаканы Дзень Перамогі.

Кожны год у Беларусі праходзіць мноства мерапрыемстваў, прысвечаных Вялікай Айчыннай вайне. У мясцінах гераічных баёў і чалавечых

трагедый створаны мемарыяльныя комплексы і ўстаноўлены абеліскі, распрацаваны ўнікальныя гістарычныя маршруты.

Ва ўсіх гарадах краіны дзейнічаюць экспазіцыі пра вайну, а галоўным сховішчам рарытэтаў з'яўляецца заснаваны менавіта ў Мінску першы ў свеце музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.

У памятныя дні – пачатку вайны, прарыўных наступаў перацыі "Баграціён" і, вядома, Вялікай Перамогі – у розных кутках Беларусі праходзяць маштабныя ваенна-гістарычныя рэканструкцыі.

На некалькі гадзін перанесціся ў ваенны час можна у гераічнай Брэсцкай крэпасці і на "Лініі Сталіна" пад Мінскам, у Магілёве (бітва на Буйніцкім полі), Віцебску, Гомелі (бой пры фарсіраванні Дняпра), на Аўгустоўскім канале ў наваколлі Гродна, іншых гарадах краіны.

Прыехаўшы ў Беларусь, вы ўбачыце, з якой пашанай тут ставяцца да памяці аб Вялікай Айчыннай вайне і як берагуць мір, заваяваны цаной мільёнаў жыццяў.

# Раздзел 6. Мая Малая Радзіма




Радзіма – краіна, горад, вёска, вуліца, дарога, якая вядзе да улюбёнага месца… Разам з гэтым, думкі-ўспаміны – родная хата, бацькі, суседзі, сябры і ўсё тое, што дадзена з першых дзён жыцця чалавеку.

Сёлетні год – Год малой радзімы, што вельмі важна для нашай сучаснасці, напоўненай мабільнасцю, мітуснёй і ўсімі тымі перашкодамі, якія знішчаюць самыя галоўныя каштоўнасці чалавека. Гэты час дасць мажлівасць кожнаму зразумець для сябе, што значыць малая радзіма і дзе знаходзіцца тое месца. І тут самі сабою ўзгадваюцца словы з кнігі “Свята для сэрца” Анатоля Бензярука: “Адшукаць малую радзіму лёгка. Трэба



толькі адчыніць дзверы, выйсці на вуліцу. Усё, што ўбачыш навокал, – гэта яна, твая малая радзіма. Твая рэчка. Тваё поле. І твой лёс. Твая школа. Твая першая настаўніца… І яшчэ шмат, шмат чаго”.

Малая радзіма – святое месца. Яно цягне да сябе нябачнай, дужа моцнай ніткай. Гэта тая нітка, якая звязвае ўсё жыццё маці і дзіця. І часам шмат дзеянняў і ўчынкаў проста нельга растлумачыць.




З кожным годам усё больш і больш маленькіх населеных пунктаў знікае з карты. Жыхары вёсачак перабіраюцца ў гарады, бліжэй да прагрэсу. У хатах дзе-нідзе застаюцца старыя людзі, якія не могуць і не жадаюць пакідаць свае гнёзды, з якімі звязана ўсё іх жыццё. Але калі едзеш і глядзіш у вокны, усё часцей кідаюцца ў вочы развaленыя хаткі, закінутыя, здзічэлыя дворыкі. І сэрца сціскаецца смутным болем. А раней тут звінеў вясёлы дзіцячы гоман, нечыя моцныя рукі з раніцы працавалі з рыдлёўкай, касой, плугам, і нават праз старыя ліштвы цягнуўся пах свежаспечанага хлеба. А дзе зараз гэта ўсё? Толькі ў памяці гэтых людзей, і то недзе вельмі глыбока, за ўсімі сучаснымі праблемамі і надзённымі справамі. А што станецца з гэтымі зарослымі мохам хаткамі? Хутчэй за ўсё, на іх месцы ляжа новая дарога ці пабудуецца новы гандлёвы або забаўляльны цэнтр. І нечая малая радзіма знікне з твару зямлі… Таму мы павінны клапаціцца пра іх не менш, чым пра нашу Беларусь, і шанаваць гэтыя мясціны.



Для кожнага з нас малая радзіма – самая прыгожая і лепшая. Бо тут самыя квяцістыя сады, лепшыя краявіды, непаўторны водар, жывуць асаблівыя людзі. Невялікае месца, дзе ўсе чужыя – свае. А ўспаміны пра яго застаўляюць сэрца




грукатаць. Здавалася б, такі маленькі кусочак на зямлі, але разам з гэтым такі вялікі! Выдатны натхняльнік у жыцці і творчасць людзей. Мастакі прысвячаюць яму карціны, музыканты песні і музыку, пісьменнікі творы. І тут узнікае пытанне: якая яна, твая малая радзіма, што ты можаш распавесці пра яе куточкі.

У студэнтаў нашага ўніверсітэту есць такі куток – куток беларускай культуры. Ён называецца “Любі, браток, родны куток”. Сабраныя матэрыялы адлюстроўваюць мясціны, або куточкі, неабавязкова, дзе мы нарадзіліся, але дзе жыве наша душа, дзе сэрца адпачывае.

Студэнты і студэнткі нашага інтэрната вельмі клапоцяцца аб сваёй Малой Радзіме, шануюць яе і ніколі не забываюць, таму яны прывезлі да нас маленькі кавалачак свайго роднага края і мы запрашаем вас да нашай экспазіцыі “ Любі, браток, родны куток”, дзе на магнітнай дошчцы, мы бачым фотаздымкі з розных гарадоў нашай краіны!



# ЗАКЛЮЧЭННЕ

Сабраныя матэрыялы ў Кутку беларускай культуры даюць падставу сцвярджаць, што працэс нацыянальна-культурнага адраджэння беларускай нацыі, імкненне захаваць багатую народную культуру павінны стаць асновай эстэтычнага, маральнага выхавання моладзі.

Разважаючы над праблемамі і асблівасцямі гістарычнага развіцця беларускай народнай культуры, мы пераконваемся ў тым,што духоўная спадчына нашага народа грунтуецца на законах, якія нам неабходна ведаць і спажываць іх разумна і мудра, так як яны спажываліся з пакалення ў пакаленне, захоўваліся і павінны быць захаваны і намі для нашых нашчадкаў.

У цэнтры нашага праекта – традыцыі, культура і побыт тагачаснага беларускага народу. Праект мае на ўвазе адказы на шматлікія пытанні традыцыйнай беларускай культуры, як было, як ёсць і як павінна быць сёння. Вывучаючы культуру, побыт і традыцыі беларускага народу моладзь значна пашырае свой кругагляд, слоўнікавы запас, а таксама адчувае прыгажосць і мілагучнасць беларускай мовы і вывучае гісторыю свайго народа.

Выхаваўчая работа ў вольны ад заняткаў час – гэта сістэма мэтанакіраванага ўздзеяння на моладзь, якая дапаможа забяспечыць маральную і грамадскую дарослацсь, фарміраванне адказных адносін да набытых ведаў, прывіццё этычна-эстэтычнай культуры.

У наш час грамадства ўсё вастрэй усведамляе неабходнасць для кожгага чалавека ведаць родны край, яго гісторыю і культуру.

Сёлетні год – Год малой радзімы, што вельмі важна для нашай сучаснасці, напоўненай мабільнасцю, мітуснёй і ўсімі тымі перашкодамі, якія знішчаюць самыя галоўныя каштоўнасці чалавека. Гэты час дасць мажлівасць кожнаму зразумець для сябе, што значыць малая радзіма і дзе знаходзіцца тое месца.

Малая радзіма – святое месца. Яно цягне да сябе нябачнай, дужа моцнай ніткай. Гэта тая нітка, якая звязвае ўсё жыццё маці і дзіця. І тут узнікае пытанне: якая яна, твая малая радзіма, што ты можаш распавесці пра яе куточкі. Адказ на гэтае пытанне мжна палучыць у нашым кутку “ Любі, браток, родны куток”.

Такім чынам найважнейшай функцыяй выхавання маладога і падрастаючага пакалення краіны, з’яўляецца адраджэнне нацыянальнай самабытнасці.

## ЛІТАРАТУРА


1. Беларускія прыказкі, прымаўкі, фразеалагізмы / Склад. Ф. Янкоўскі; Прадм. Д.Я. Бугаёва. – Мінск : Беларуская навука, 2014. – 494 с.
2. Клышка, М.К. Слоўнік сінонімаў і блізказначных слоў / М.К. Клышка. – Мінск : Беларуская навука, 2015. – 592 с.
3. Мажэйка, Н.С. Частотны слоўнік беларускай мовы / Н.С. Мажэйка. – Мінск : Зоркі гор, 2015. – 658 с.
4. Прыказкі пра гасціннасць [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://prykazki.blogspot.com/2017/01/2_26.html. – Дата доступу: 16.03.2019
5. Успенский, Л. Почему не иначе. Этимологический словарь школьника / Л. Успенский. – Москва : АСТ, 2011. – 464 с.
6. Фасмер М. Этимологический словарь русского языка: В. 4-х т. Т.1 – Москва: Прогресс. – 2013. — Т. 1. — 562 с.
7. Шаўко, А. Гасціннасць – наша візітная картка / А. Шаўко // Белорусская Нива [Электронны рэсурс]. – 4 студзеня 2014. – Рэжым доступу: http://www.belniva.by/news_full.php?id_news=64872. – Дата доступу: 19.03.2019.
8. Багдановіч І. Э. Авангард і традыцыя: Беларуская паэзія на хвалі нацыянальнага адраджэння. — Мн., 2012.
9. Беларуская літаратура: XI—XX стст.: Дапам. для шк., ліцэяў, гімназій, ВНУ / А. І. Бельскі, У. Г. Кароткі, П. І. Навуменка і інш. — 2-е выд., дапрац. — Мн., 2011.
10. Беларускія пісьменнікі (1917—1990): Даведнік / Складальнік А. К. Гардзіцкі. Пад рэд. А. Л. Верабей — Мн.: Мастацкая літаратура, 2012. — 653 с. — 22000 экз. — ISBN 5-340-00709-X.
11. Беларускія пісьменнікі: Біябібліягр. слоўнік: У 6 т. — Мн., 2010—2013.
12. Бельскі А. Сучасная літаратура Беларусі: Дапам. для настаўнікаў. — Мн., 2009.
13. Гаранін Л. Я. Нацыянальная ідэя ў беларускай літаратуры пачатку XX стагоддзя. — Мн., 2003. Гарэцкі М. Гісторыя беларускае літаратуры. — Мн., 2003.
14. Локун В. Кругі жыцця — кругі літаратуры. — Мн., 2002.
15. Яскевіч А. А. Абранне вечнасці. Універсалізм традыцыі і гістарызм сучаснасці. — Мн., 2002.

## ДАДАТКІ



# Куток беларускай культуры “Я нарадзіўся тут”.

## Ход экскурсіі:

***1 экскурсавод:***

Уздыхаць па старых рэчах, вяртацца да старога ўкладу жыцця не варта, але ведаць, як жылі нашы дзяды-прадзяды, трэба. А пры святле свечкі на покуце ў бацькоўскай хаце, пры святле малітвы ў душы відаць і тое, што засталося ў мінулым, і ясніцца шлях у будучыню.




***2 эксурсавод:***

Мы пачынаем нашу экскурсію словамі знакамітага сына беларускай зямлі Якуба Коласа:

О, край родны, край прыгожы!
Мілы кут маіх дзядоў!
Што мілей у свеце божым
Гэтых светлых берагоў,
Дае бруяцца срэбрам рэчкі,
Дзе бары-лясы гудуць,
Дзе мядамі пахнуць грэчкі,
Нівы гутаркі вядуць;
Гэтых гмахаў безгранічных
Балатоў тваіх, азёр,
Дзе пад гоман хваль крынічных
Думкі думае прастор;
Дзе увосень плачуць лозы,
Дзе вясной лугі цвітуць,
Дзе шляхом старым бярозы
Адзначаюць гожа пуцьʼ?



***1 экскурсавод:*** Вельмі важнае месца ў хаце беларускага селяніна займала печ. Да печы адносіліся як да жывой істоты. Забаранялася ўжываць “у яе прысутнасці” грубыя, або непрыстойныя словы. “Няможна гэта казаць, бо печ у хаце”, “Сказаў бы, дык печ пачуе”, – так гаварылі нашы дзяды і прадзеды. Адзін з асноўных рытуальных цэнтраў сялянскага жылля – ачаг, вакол якога ў халодны час групавалася жыццё ў хаце, а таксама рыхтавалася ежа. Яшчэ і сёння існуе выраз «танчыць ад печкі», якое недвухсэнсоўна ўказвае на яе цэнтральнае (адно з першарадных) месца ў хаце. Да печы заўсёды ставіліся з вялікай увагай і павагай.

На ёй адпачывалі, яна саграvала і лячыла. Вакол печы былі расстаўленыя ўсе хатнія атрыбуты: венік, вілы, качарга, дзяжа, – а за печкай жыў захавальнік сямейнага дабрабыту – дамавік. Канструкцыя печы цалкам паўтарала структуру хаты і таксама з'яўлялася ўвасабленнем міфапаэтычнай мадэлі свету.

Яе структурныя гарызонты адпавядалі нашаму ўспрыманню часу. Падпечак (як і склеп) сімвалізаваў мінулае; вусце і засланка – дзень сённяшні; труба (комін), якая перакрывалася юшкай (душой, душкай), – будучыню. «Завіхацца каля печы» – выключна жаночы занятак. Падтрыманне агню і падрыхтоўка ежы былі падобныя на падтрыманне жыцця на зямлі.



Каля печы знаходзіліся: **качарга** – жалезны прут, сагнуты на канцы, для перамешвання паліва ў печы, выграбання попелу і пад.

**Ухват** служыць для падхвату гаршкоў, чыгункоў, якія ставяць у печ або дастаюць з яе.

**Сякера –** прылада працы для апрацоўкі драўніны і іншых матэрыялаў.

**Таўкач** – прылада ў выглядзе качалкі з патоўшчаным круглым канцом, якой таўкуць што-небудзь.

**Цапы** – доўгія, гладка абчэсаныя палкі з прымацаванымі да іх бічамі; выкарыстоўваліся для малацьбы жыта, аўса, ячменя.

***2 экскурсавод:***

Вельмі важным прадметам мэблі быў ложак. Яго заўседы ставілі ў добрае месца, а месца гэтае выбіралася наступным чынам: куды кот сядзе - туды і ложак устане. Дрэннай прыкметай лічылась спаць нагамі да дзвярэй, бо такім чынам выносілі з хаты нябожчыкаў. Пад ложак звычайна клалі бурштын и часнок, у якасьці абароны ад злых сіл.

Ёсць у вясковай хаце месца, дзе пасядзець лічыцца за вялікі гонар. **Покуць** – так называецца гэтае пачэснае месца ў хаце, не забытае Богам *(паказвае).*Покуць спрадвеку ачышчала і ўзвышала чалавека, рабіла яго лепшым. Прыходзіла свята, Каляды ці Вялікдзень, і на покуці першы садзіўся гаспадар, а злева ад яго астатнія сямейнікі. І ні абы як, а ўперамешку, па старшынству, дарослыя і дзеці. Маліліся, успаміналі добрым словам дзядоў-прадзедаў, частаваліся.



Покуць – гэта кусочак храма ў хаце. Уверсе, пад самай столлю, вісяць абразы – з выявамі Ісуса Хрыста і святых. Яны маўкліваю малітваю асвячаюць хату і жыццё людзей у гэтай хаце.Покуць прыгожа ўбіраецца. На абразы гаспадыня вешае ўзорныя ручнікі – набожнікі. На покуці мясціліся стол і лава. Стол выконваў ролю своеасаблівага хатняга алтара, таму ставіліся да яго з павагай і дапусціць на стол ката лічылася вялікім грахом, бо тут заўсёды знаходзіліся хлеб ды соль.

***1 экскурсавод:***

А вось перад вамі – **маслабойка** *(паказвае)*. Калі малако адстойвалася ў збанках, гаспадыня збірала зверху смятану – густы, тлусты слой. Назапашвала смятаны ўдосталь і біла з яе ў бойцы масла. Масла білі ўручную.



*Прыгадваецца казка пра дзвюх жабак, якія трапілі ў пастку – збанок са смятанаю. Адна жабка адразу выдыхнулася, здалася і патанула ў смятане. А другая, упартая, доўга працавала лапкамі, як калатоўкаю, і збіла са смятаны масла. Стала на грудку масла і выскачыла са збанка на волю. Казка цікавая і павучальная: ніколі не падайце духам, сябры, верце ў свае сілы – і зможаце выбрацца з любой пасткі.*

А вось тут мы бачым **сіта** - драўляная рама з рагожнамі або драцянымі сітамі для правейвання збожжа, якую на вяроўках падвешвалі да бэлькі.



**Карыта** прадаўгаватая пасудзіна, выдзеўбанная з дрэва або збітая з дошак. Выкарыстоўваецца звычайна для кармлення і вадапою жывёлы.




Доўга ў Беларусі карысталіся **бязменам**. **Бязмен** – даўняя ручная рычажная вага. Металічны або драўляны стрыжань з пастаянным грузам(гірай) на адным канцы і кручком ці чашкай для ўтрымання грузу на другім. На стрыжні шкала адліку і рухомая апора — абойма ці драцяная пятля. Карысталіся бязменам пераважна ў народным побыце.

***2 экскурсавод:***

У кожным двары абжывалася цэлае сямейства кашоў, старых і новых, вялікіх і малых.



Без іх, лёгкіх і зручных, не абыходзіліся ні дарослыя, ні дзеці *(падыходзіць і паказвае).* У кашах з плеценымі вечкамі захоўваліся сушаныя каўбасы, палядвіцы, кумпякі.

Гэты вялікі кош, які называлі **саж,** зразумела, служыў не для збору бульбы. У яго нашы дзядулі і бабулі складалі сала, каўбасы і падвешвалі на крук да столі, каб не далезлі мышы і пацукі. У некаторых рэгіёнах Гарадзеншчыны з гэтай жа мэтай выкарыстоўвалі драўляныя куфары.

**Кош –** плеценая з лазы, карэння і інш. Круглая пасудзіна для складання і пераноскі чаго-небудзь.

**Цапы** – доўгія, гладка абчэсаныя палкі з прымацаванымі да іх бічамі; выкарыстоўваліся для малацьбы жыта, аўса, ячменя.

**Крук –** драўляная палка з сукамі на канцы або з двухзубым наканечнікам для скідвання гною з воза.



*1 экскурсавод:*

**Качалка** – прыспасабленне для разгладжвання вырабаў з тканіны. Вопратку раскачвалі **валікам** – гэта драўляны брус з нарэзанымі ўпоперак зубцамі і ручкай. Зубцы размяшчаліся шчыльна адзін каля аднаго *(паказ экспанатаў).*




Калі вы ўважліва паглядзіце, то пабачыце калекцыю **жалезных прасаў** *(паказ экспанатаў).*Працавалі яны на вуглях. Каб працаваць такім прасам, спачатку неабходна было ўнутар пакласці гарачыя бярозавыя вуглі. Каб зноў распаліць патухшыя вуглі, трэба было падуць ці памахаць прасам з боку ў бок.

*2 экскурсавод:*

У зімовы час сялянская хата ператваралася ў рамесную майстэрню. У доўгія вечары пры святле лучыны, светача ці каганца тут рабілі лыжкі і посуд, плялі лапці і пралі, ткалі, шылі адзенне і вышывалі.

Лён – заўсёды быў улюблёная расліна славянскіх народаў. З яго валакна выраблялі вопратку, вяроўкі і нават абутак. Вырашчаны лён трэба было сабраць, звязаць у снапы, а потым раскласці на полі, каб пад уплывам сонца, ветру і дажджу адышла кастрыца. Гэта патрабавала шмат намаганняў і часу. Цяжка было пераўтварыць льняныя сцяблы ў валакно, а затым у тканіну.




У нашай музейнай хаце знаходзяцца некаторыя прылады ткацтва: **трапло, бёрды, прасніца, сукала, калаўрот, чаўнок, верацяно і іншыя** (*паказ экспанатаў*).

**Бёрда** - ткацкая прылада, што служыць для прыбівання ўтку ў кроснах. Прамавугольная рама (шырыня 40 – 50 см і больш, вышыня 15 – 18 см) з устаўленымі і замацаванымі пласцінкамі (трасцінкамі) з тонкай (1 мм) асінавай ці кляновай лучынкі. У XX ст. берда пачалі рабіць з металічнымі пласцінкамі. Для ткання бёрда ўстаўлялася ў набіліцы. Бёрду выраблялі спецыяльныя майстры – бёрднікі. Памеры бёрда вызначаліся якасцю будучай тканіны. Для атрымання грубай тканіны іх рабілі шырэйшымі, а зубы радзей. Для вырабу тонкіх тканін выкарыстоўваліся больш густыя бёрда.

**Траплом** трапалі лён, і, магчыма, адсюль пайшла мянушка надта гаваркому чалавеку.




**Калаўрот** - прылада для прадзіва. На Беларусі вядомы два тыпы калаўрот-стаяк і ляжак. Абодва тыпы мелі аднолькавыя рабочыя часткі: кола, педаль, якой кола прыводзілася ў рух і прадзільны апарат. Апошні складаўся са стрыжня і размешчанай на ім шпулькі для намотвання пражы і маленькіх калёсікаў, злучаных пры дапамозе шнуроў з вялікім колам. У калаўроце-стаяку кола знаходзілася паміж двюмя вертыкальнымі стойкамі над прадзільным апаратам. **Сукала** – прылада для намотвання нітак на шпульку ткацкага станка. **Прасніца (на здымку з кудзеляй)** - драўляная прылада для прадзення воўны, льняной і пяньковай кудзелі.



**Верацяно** - прылада для ручнога прадзення льну, воўны, пянькі. У старажытныя часы для гэтага служыла драўляная, крыху завостраная палачка даўжынёй 20-30 см з завостраным верхам, патоўшчаным нізам, на які для павелічэння вагі надзявалі прасліца, і вострай пяткай. Яго выстругвалі нажом або выточвалі з бярозы, ясеню, грушы і інш.

**Чаўнок** - ткацкая прылада для пракідання ўтку ў працэссе ткання (па знешняму выгляду нагадвае мініацюрны човен). Вядомы дзве разнавіднасці – з донцам і полы. У першым выпадку цэўку кладуць на дно, а ўточную нітку прапускаюць праз адтуліну збоку ці ў донцы чаўнака (у працэссе ткання прытрымліваюць цэўку вялікім пальцам). У полым чаўнаку цэўку мацуюць на тонкім металічным стрыжні, таму яго не трэба было прытрымліваць (такі чаўнок як больш дасканалы ужываўся часцей. Акрамя лодкападобных вядомы быў і вілкападобны чаўнок – ігліца (дошчачка з дзвюма выемкамі на канцах), які служыў для вырабу падвойных дываноў.




Адным з самых старажытных промыслаў беларусаў было ткацтва. На працягу стагоддзяў яно перадавалася з пакаленняў у пакалення. У народным ткацтве захавалася гісторыя беларускага народа і яго майстэрства. Сыравінай для ткацтва быў лён або авечая воўна.

***1 экскурсавод:***

Калі мы звернем увагу на традыцыйнае мастацтва, якое можам пабыць зверху, то адразу можна сказаць, што шэта — праява самасвядомасці пэўнай асобы і цэлага народа. У нашам выпадку гэта саламяныя павукі. Выраблялiся яны ўсёй сям’ёй да дня зімовага сонцастаяння. Павукі сімвалізавалі сусвет і яго стваральніка, таму вешаліся на ганаровым месцы — над сталом ці на покуці, а пасля зімы спальваліся. Ці тыя ж вербы, якія ўпрыгожваюць на Вербніцу, — гэта

яшчэ дахрысціянская традыцыя. Сюды закладзены культ уваскрасення, абуджэння прыроды ад сну пасля зімы. І, ведаючы гэта, я не магу ўпрыгожыць вярбу пластыкавай кветкай. Упрыгожанне павінна быць натуральным, прыродным. Разнастайныя вырабы з саломы здаўна самым цесным чынам звязваліся з каляндарнымі абрадамі і звычаямі. Напрыклад, на Каляды рабілі фігурку ў выглядзе казы, і яна сімвалізавала сабой культ урадлівасці і пладавітасці. А ведаеце, што такое «павук»? Раней у сялянскіх хатах «павукоў» рабілі дзеці, а бацькі вывешвалі напярэдадні Калядаў у самым пачэсным месцы — чырвоным куце. «Павук» аберагаў жыллё, збіраў у «павуціну» сваёй канструкцыі ўсё негатыўнае, што магло перашкодзіць





шчасліваму жыццю гаспадароў. Праз год «павука» палілі, замяняючы на новы. Такое ж кароткае жыццё было ва ўсіх рытуальных вырабаў з саломкі: у пачатку абрада яны нараджаліся, у канцы — паміралі. Саламяныя вырабы зараз набываюць больш у якасці сувеніраў: кветачкі для ўпрыгожвання інтэр'еру, павукі ў якасці падарунка замежным гасцям або для сябе, каб вярнуць калядныя традыцыі.

Хоць і цяжка жылося нашым продкам, але не страцілі яны пачуцця прыгожага. Звярніце, калі ласка, увагу, якую вопратку насілі сяляне вёскі. Вось тут мы можам пабычыць **кашулі** – вопратка з лёгкай тканіны, якая пакрывае верхнюю частку цела і ўжываецца як частка бялізны ці як верхняя

вопратка.

Усё рабілі сваімі рукамі, пачынаючы ад саматканай тканіны да ўзораў вышыўкі на ручніках і посцілках. Вочы разбягаюцца ад стракатай прыгажосці фартушкоў і посцілак, абрусаў і ручнікоў. Не, такіх абноў у краме не купіш: у іх жыццё, натхненне, душа таленавітых народных творцаў.

**Ручнікі** *(паказ экспанатаў)* не толькі ўпрыгожвалі інтэр’ер хаты, але і шырока выкарыстоўваліся ў беларускіх абрадах. На вяселлі хлебам-соллю на ручніку сустракалі маладых пасля вянчання ў царкве. Ужываўся ручнік і ў якасці падножніка, на які станавіліся маладыя ў час вянчання. Адыходзячы ад аналоя, нявеста старалася цягнуць за сабой і ручнік. Гэта рабілася для таго, каб сяброўкі цягнуліся за ёю, выходзілі замуж. Самых паважаных гасцей падчас урачыстасцей і зараз сустракаюць хлебам-соллю на прыгожых ручніках.






**Узорныя посцілкі** сталі ткаць значна пазней, чым ручнікі і абрусы, бо ложкі ўвайшлі ў быт сялян вельмі позна. Але мастацкае аздабленне іх досыць высокае. Рознымі колерамі вясёлкі, шматлікімі ўзорамі радуюць нас гэтыя вырабы.

***2 экскурсавод:***

Прыгожа глядзіцца гліняны посуд і на кухоннай паліцы, і на абедзенным стале. **Збанок –** пасудзіна добра вядомая. У ім звычайна трымалі малако: доўга



не скісае, а ў гарачыню – халоднае. Мае ручку і

носік-дзюбку, каб тое ж малако лёгка, роўным струменчыкам лілося ў міску ці ў кубак. **Гарлачык** – старэйшы за збан. Яны падобныя, як браты, толькі гарлачык без ручкі і не мае носіка-дзюбкі і зверху. Прыгажосцю вызначаецца залацісты колер паверхні, які яшчэ выразней выдзяляецца пад шклопадобнай палівай. Часам посуд аздаблялі роспісам у выглядзе паяскоў, зігзагаў, раслінных парасткаў. Разнастайны мастацкі эфект набываў посуд і ад абпалу. Напрыклад, надта каларытна выглядае ***гартаваны, ці рабы, абварны*** посуд. Напаленыя у горне вырабы загартоўваліся у карыце, з рэдка разведзенай мукой. Посуд станавіўся моцным пры гэтым пакрываўся маляўнічымі чорна-карычневымі плямамі.

Характэрнае аблічча мае і ***чорна-глянцаваная*** кераміка. Яе абпальвалі ў наглуха закрытым горне без доступу кіслароду. У выніку пэўных хімічных рэакцый у гліне вырабы набывалі матавы






чорны ці сіняваты колер. Калі ж перад абпалам ганчар каменчыкам наводзіў на паверхні посуду разнастайныя узоры, яны станавіліся бліскучыя, нібыта металічныя.

Побач ляжыць **апалонік –** вялікая лыжка, якой разліваюць страву і чэрпаюць ваду.

***1 экскурсавод:***

Здаўна на ўсёй Беларусі бытуюць разнастайныя вырабы, пляцёныя з лазы, саломы, чароту, каранёў. Асабліва шырока скарыстоўвалася для гэтых мэтаў **салома.** Здавалася б вельмі празаічны матэрыял. Тым не менш салома прыдатная для вырабу самых розных рэчаў, як гаспадарчага, так і мастацкага прызначэння. Часцей за ўсё з яе плялі самы розны посуд.

З асаблівым майстэрствам выпляталіся рэчы, якія прызначаліся у падарунак, гэта розныя куфэркі, шкатулкі, прызначаныя для жаночага рукадзелля, нітак, іголак, іншай драбязы.



Аснову дэкору складалі гранёныя пляцёнкі, выпуклыя рамбічныя ўстаўкі, шахматна-перапляцёныя разнагладжаныя саломінкі. Ўсё гэта вышывалі на кардонную аснову і атрымліваўся надзвычай дэкаратыўны выгляд, які меў не толькі практычнае, але і мастацкае прызначэнне, як упрыгожанне жылля.

***2 экскурсавод:***

Сёння найбольш пашыраным відам саломапляцення які стаў шырока вядомы за межамі краіны з’яўляецца выраб аб’ёмных фігурак: людзей, жывёл і нават цэлых кампазіцый на фальклорныя, бытавыя, гістарычныя тэмы. Яны ярка ілюструюць асаблівасці развіцця гэтага віду беларускага народнага мастацтва за некалькі апошніх дзесяцігоддзяў. Саламяныя фігуркі людзей, жывёл, птушак у народным побыце вядомыя здалёк. Большасць з іх несумненна падзялялася.

***1 экскурсавод:***

*Існуе такая легенда. Чалавеку сказалі, каб ён, адыходзячы , ад хаты, не азіраўся назад, іначай ператворыцца ў слуп солі. Чалавек не стрымаў слова і азірнуўся… Дык як жа не азірнешся, калі родная сядзіба – гэта цэлы свет. Часцей азірайцеся, сябры, назад, у мінулае, каб не пагасла свечка на покуці – у бацькоўскай хаце, каб лягчэй было ісці наперад, у будучыню.*

*2 экскурсавод:*

Таксама ў нас знаходзіцца невялікая выстаўка фотаздымкаў часоў Вялікай Айчыннай вайны. У гады Вялікай Айчыннай вайны Беларусь страціла кожнага трэцяга жыхара, але нават залітая крывёй мільёнаў людзей, разрабаваная і напаўразбураная, краіна не здавалася. Праз многія дзесяцігоддзі памяць пра подзвіг народа, які ўнёс вялікі ўклад у Перамогу над фашызмам – свяшчэнная.

*1 экскурсавод:*

На беларускай зямлі былі разрабаваны і разбураны 209 з 270 гарадоў. Фашысты правялі ў Беларусі больш за 140 карных аперацый, поўнасцю або часткова знішчыўшы 5454 вёскі.

Сумна вядомым сімвалам бязлітаснай расправы стала спаленая разам з людзьмі Хатынь, лёс якой падзялілі яшчэ сотні вёсак краіны…

На тэрыторыі Беларусі фашысты стварылі больш як 260 лагераў смерці і месц масавага знішчэння людзей. У гэтым трагічным спісе:




- чацвёрты па велічыні ў Еўропе лагер смерці "Трасцянец", дзе знішчылі больш за 200 тысяч чалавек (ёсць сведчанні, што ахвяр было намнога больш – амаль 546 тысяч);
- жудасны дзіцячы канцлагер у вёсцы Чырвоны Бераг, дзе самымі бесчалавечнымі спосабамі з юных ахвяр – да смерці – забіралі кроў для патрэб нямецкіх шпіталяў;
- Азарыцкая зона смерці, дзе пад адкрытым небам нацысты трымалі тысячы хворых на сыпны тыф, збіраючыся выкарыстоўваць людзей у якасці бактэрыялагічнай зброі супраць наступаючай Чырвонай Арміі…

Паводле няпоўных даных, у лагерах на тэрыторыі Беларусі нацысты знішчылі амаль 1,5 мільёна чалавек – не толькі мясцовых жыхароў, але і вывезеных з Аўстрыі, Польшчы, Чэхаславакіі, Францыі, Германіі…

*2 экскурсавод:*

Пасля заканчэння той страшэннай вайны Беларусь яшчэ доўгія гады аднаўлялася ад разбурэнняў і страт. І да нашых дзён краіна свята шануе памяць аб ахвярах фашызму, подзвігу герояў і мужнасці людзей, якія жылі ў цяжкі час і аддавалі ўсё, каб наблізіць доўгачаканы Дзень Перамогі.

Кожны год у Беларусі праходзіць мноства мерапрыемстваў, прысвечаных Вялікай Айчыннай вайне. У мясцінах гераічных баёў і чалавечых трагедый створаны мемарыяльныя комплексы і ўстаноўлены абеліскі, распрацаваны ўнікальныя гістарычныя маршруты.

Ва ўсіх гарадах краіны дзейнічаюць экспазіцыі пра вайну, а галоўным сховішчам рарытэтаў з'яўляецца заснаваны менавіта ў Мінску першы ў свеце музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.

У памятныя дні – пачатку вайны, прарыўных наступаў аперацыі "Баграціён" і, вядома, Вялікай Перамогі – у розных кутках Беларусі праходзяць маштабныя ваенна-гістарычныя рэканструкцыі.

*1 экскурсавод:*

На гэтых снімках добра відаць Хатынь, знакамітую сваім трагічным лёсам. Зараз Хатынь — мемарыяльны комплекс на месцы колішняй вёскі ў Лагойскім раёне Мінскай вобласці Беларусі. 22 сакавіка 1943 года была знішчана нямецкімі карнымі войскамі пры ўдзеле 118-га паліцэйскага батальёна, які быў сфарміраваны ў асноўным з палонных чырвонаармейцаў, за тое, што жыхары вёскі быццам дапамагалі партызанам.

*2 экскурсавод:*

Раніцай 22 сакавіка 1943 года на скрыжаванні дарог Плешчаніцы—Лагойск і Казыры—Хатынь партызаны атрада «Мсцівец» абстралялі легкавую машыну, у якой ехаў камандзір адной з рот 118 паліцэйскага батальёна гаўптман Ганс Вёльке. Вельке быў першым немцам, які заваяваў залаты алімпійскі медаль у лёгкай атлетыцы. Разам з былым лёгкаатлетам былі забітыя яшчэ некалькі паліцаяў-украінцаў.[2] Паліцаі 118 батальёнавыклікалі на дапамогу спецыяльны батальён штурмбанфюрэра Оскара Дырлевангера. Па дарозе з Лагойска, паліцаі арыштавалі і неўзабаве расстралялі групу мясцовых жыхароў — лесасекаў. Да вечара 22 сакавіка, карнікі па слядах партызанаў выйшлі да вёскі Хатынь, якую спалілі разам з усімі яе жыхарамі. Камандаваў

распраўай начальнік штаба 118 паліцэйскага батальёна Рыгор Васюра, былы старшы лейтэнант Чырвонай Арміі.

***1 экскурсавод:***

Радзіма, як і маці, у кожнага адна, і нават калі добра на чужыне, у сэрцы ўсё роўна сум па родных краявідах: палях, блакітных азёрах і высокіх соснах, якія чырванеюць раніцай на ўзгорку. Зразумела, што кожны звяртае ўвагу на розныя бакі жыцця. Адзін з замілаваннем назірае за квітненнем садоў і залатымі ад збожжа нівамі, а іншы засяроджвае ўвагу на тым, якая цяжкая праца стаіць за ўсёй гэтай прыгажосцю. Як бы то не было, у вершах пра Беларусь можна знайсці ўсё: і тугу ад цяжкай нядолі, і шчасце нарадзіцца пад гэтым небам, сінім, як родныя васількі.



***2 экскурсавод:***

Сёлетні год – Год малой радзімы, што вельмі важна для нашай сучаснасці,



напоўненай мабільнасцю, мітуснёй і ўсімі тымі перашкодамі, якія знішчаюць самыя галоўныя каштоўнасці чалавека. Гэты час дасць мажлівасць кожнаму зразумець для сябе, што значыць малая радзіма і дзе знаходзіцца тое месца. І тут самі сабою ўзгадваюцца словы з кнігі “Свята для сэрца” Анатоля Бензярука: “Адшукаць малую радзіму лёгка. Трэба толькі адчыніць дзверы, выйсці на вуліцу. Усё, што ўбачыш навокал, – гэта яна, твая малая радзіма. Твая рэчка. Тваё поле. І твой лёс. Твая школа. Твая першая настаўніца… І яшчэ шмат, шмат чаго”.

***1 экскурсавод:***

Малая радзіма – святое месца. Яно цягне да сябе нябачнай, дужа моцнай ніткай. Гэта тая нітка, якая звязвае ўсё жыццё маці і дзіцяці. І часам шмат дзеянняў і ўчынкаў проста нельга растлумачыць.



З кожным годам усё больш і больш маленькіх населеных пунктаў знікае з карты. Жыхары вёсачак перабіраюцца ў гарады, бліжэй да прагрэсу. У хатах дзе-нідзе застаюцца старыя людзі, якія не могуць і не жадаюць пакідаць свае гнёзды, з якімі звязана ўсё іх жыццё. Але калі едзеш і глядзіш у вокны, усё часцей кідаюцца ў вочы разваленыя хаткі, закінутыя, здзічэлыя дворыкі. І сэрца сціскаецца смутным болем. А раней тут звінеў вясёлы дзіцячы гоман, нечыя моцныя рукі з раніцы працавалі з рыдлёўкай, касой, плугам, і нават праз старыя ліштвы цягнуўся пах свежаспечанага хлеба. А дзе зараз гэта ўсё? Толькі ў памяці гэтых людзей, і то недзе вельмі глыбока, за ўсімі сучаснымі праблемамі і надзёнными справамі. А што станецца з гэтымі зарослымі мохам хаткамі? Хутчэй за ўсё, на іх месцы ляжа новая дарога ці пабудуецца новы гандлёвы або забаўляльны цэнтр. І нечая малая радзіма знікне з твару зямлі… Таму мы павінны клапаціцца пра іх не менш, чым пра нашу Беларусь, і шанаваць гэтыя мясціны.

***2 экскурсавод:***

Для кожнага з нас малая радзіма – самая прыгожая і лепшая. Бо тут самыя квяцістыя сады, лепшыя краявіды, непаўторны водар, жывуць асаблівыя людзі. Невялікае месца, дзе ўсе чужыя – свае. А ўспаміны пра яго застаўляюць сэрца грукатаць. Здавалася б, такі маленькі кусочак на зямлі, але разам з гэтым такі вялікі! Выдатны натхняльнік у жыцці і творчасць людзей. Мастакі прысвячаюць яму карціны, музыканты песні і музыку, пісьменнікі творы. І тут узнікае пытанне: якая яна, твая малая радзіма, што ты можаш распавесці пра яе куточкі.

***1 экскурсавод:***




У студэнтаў нашага ўніверсітэту есць такі куток – куток беларускай культуры. Ён называецца “ Любі, браток, родны куток”. Сабраныя матэрыялы адлюстроўваюць мясціны, або куточкі, неабавязкова, дзе мы нарадзіліся, але дзе жыве наша душа, дзе сэрца адпачывае.

*Мая Беларусь –*
*Край Дняпра і Палесся,*
*Празрыстых азераў і рэк,*
*Айчына бунтарскай купалаўскай песні,*
*Што ў сэрца запала навек.*
*Край фабрык, машын*
*І сівой Белавежы*
*Са сцежкамі дужых зуброў.*
*Як Нёман – магутны,*
*Як Нарач – бязжны*
*І звонкі, як струны баоў ...*

*Пятро Прыходзька*

***2 экскурсавод:***

Студэнты і студэнткі нашага інтэрната вельмі клапоцяцца аб сваёй Малой Радзіме, шануюць яе і ніколі не забываюць, таму яны прывезлі да нас маленькі кавалачак свайго роднага края. Таму мы запрашаем вас да нашай экспазіцыі “Любі, браток, родны куток”, дзе на магнітнай дошчцы мы бачым магніцікі з фотаздымкамі родных мясцін нашых студэнтаў!



# Адкрыццё кутка “Я нарадзіўся тут”.




26.02.2020 у інтэрнаце №2 адбылося ўрачыстае адкрыццё кутка беларускай культуры “Я нарадзіўся тут”. Адной з частак кутка з’яўляецца экспазіцыя сялянскай хаты з аўтэнтычнымі прадметамі народнага побыту: посуд, гаспадарчы інвентар, мужчынскі і жаночы касцюмы, тканыя рушнікі, абрусы, вышытыя карціны, саламяныя вырабы і інш.

Стваральнікамі кутка беларускай культуры з’яўляюцца выхавацель інтэрната Дырда Жанна Мікалаеўна разам са студэнтамі, а таксама аддзел выхаваўчай працы на чале з Булыгай Іннай Сяргееўнай.

Мы доўга працавалі каб здзяйсніць нашу мару, і дзякуючы намаганням, 26 лютага мы змаглі паказаць тое, на што так шмат часу было патрачана.

На адкрыцці прысутнічала многа паважаных гасцей, сярод студэнтаў інтэрната, яго выхавацелей, заведуючых і працаўнікоў універсітэта і інтэрната, да нас зайшлі прарэктар па выхавыўчай працы Варабей Ганна Мікалаеўна і прарэктар па навуковай працы Клімук Уладзімір Уладзіміравіч.

Вялікую цікавасць выклікае магнітная дошка з выявай нашай краіны, дзе студэнты Баранавіцкага дзяржаўнага ўніверсітэта размясцілі магніты з сваіх гарадоў і мястэчак . Разам з дошкай, тут размешчаны вырабы мясцовых умельцаў: ганчарства, вышыўка і вязанне, вырабы з лазы і саломы.




Адкрыццё пачалося з ветлівых слоў павагі да гасцей і стваральнікаў кутка, слоў удзячнасці і танцаў. Пасля прарэктар па

навуковай працы Клімук Уладзімір Уладзіміравіч урачыста разрэзаў чырвоную ленту і з гэтага моманта наш куток афіцыйна адркрыўся.



Студэнты, якія праводзілі экскурсію ў нашым кутке беларускай культуры яскрава прадэманстравалі побыт і жыццё беларускіх сялян старажытнасці.



Госці з цікавасцю назіралі за ходам мерапрыемства і задавалі пытанні наконт дзіўных прылад працы, змешчаных у памяшканні. З задавальнненем прымалі госці ўдзел і ў шматлікіх віктарынах і гульнях, выказвалі свае меркаванні і думкі, разам жартавалі.



А як жа без хлеба з соллю? На прыканцы мерапрыемства стваральнікі кутка “Я нарадзіўся тут” пачаставалі галоўных гасцей прыгожым караваем і маленькімі, але не менш смачнымі каравайчыкамі.

У знак падзякі нашаму кутку даравалі эксклюзіўную кнігу водгукаў у драўлянай вокладцы, дзе пасля адкрыцця з’явіліся першыя словы ўдзячнасці і захаплення.









Госці і стваральнікі кутка “Я нарадзіўся тут”.

**Наведванне “ Кутка беларускай культуры “Я нарадзіўся тут” студэнтамі і гасцямі ўніверсітэта.**



Усё, што стваралася рукамі нашых таленавітых продкаў і ствараецца сучаснымі майстрамі, варта самай пільнай ўвагі. У наш час гэтыя вырабы набываюць больш эстэтычныя, чым практычныя патрэбы, што не зніжае нашага вялікага інтарэсу да іх. Лепшыя ўзоры культурнай самабытнасці з’яўляюцца нашай спадчынай, і яе захаванне – клопат усіх пакаленняў.



Адной з асноўных задач нашай установы з’яўляецца маральна-патрыятычнае выхаванне студэнтаў. Неабходна далучаць іх да культуры свайго народа,



пакольkі зварот да спадчыны выхоўвае павагу, гордасць за зямлю, на якой жывеш. Навучэнцам неабходна ведаць і вывучаць культуру сваіх продкаў.

Экспанаты кутка збіралі разам — студэнты, бацькі, выхавацелі, а таксама аддзел выхаваўчай працы. У асноўным яны былі прывезены з розных рэгіёнаў, дзе жывуць родныя некаторых студэнтаў. Гэта розныя старадаўнія прадметы: посуд, гаспадарчы інвентар, мужчынскі і жаночы касцюмы, тканыя рушнікі, абрусы, вышытыя карціны, саламяныя вырабы і інш.



І сапраўды, маленькая беларуская хатка з'яўляецца крыніцай беларускай культуры, гісторыі, традыцый, рамёстваў і фальклору. Не ўсе сучасныя бацькі маюць магчымасць пазнаёміць дзяцей з гісторыяй, культурай і традыцыямі беларусаў. Таму ўстановы адукацыі ствараюць умовы для азнаямлення моладзі з гісторыяй роднага краю, з побытам нашых продкаў. Вось і ў нашай установе адбылося адкрыццё этнаграфічнага кутка "Я нарадзіўся тут". Перад намі стаяла мэта стварыць умовы не толькі для правядзення абзорных і тэматычных экскурсій, але і для пазнавальна-практычнай дзейнасці. Нашы выхаванцы набываюць магчымасць пазнаёміцца з прынцыпам работы розных прыладаў працы, з уласцівасцямі і якасцямі традыцыйных матэрыялаў (лён, саломка, гліна, воўна).





На адкрыцці этнагарафічнага кутка "Я нарадзіўся тут" прысутнічалі важныя госці - прарэктар па выхавыўчай працы Варабей Ганна Мікалаеўна і прарэктар па навуковай працы Клімук Уладзімір Уладзіміравіч, начальнік аддзела па выхаваўчай працы Булыга Інна Сяргееўна.

А зараз наш куток наведваюць студэнты Баранавіцкага дзяржаўнага ўніверсітэта, выкладчыкі, настаўнікі гарадскіх школ і вучні. Экскурсію прадстаўляюць студэнткі факультэта Славянскіх і Германскіх моў – Ганакова Крысціна і Шлег Аліна. Шмат добрых уражанняў атрымалі гледачы ў час наведвання кутка “Я нарадзіўся тут”, спадзяемся, што такія ж добрыя пачуцці застануцца і ў вас!